Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Па вёсках нашага краю»**

# Малой радзімы прыцяжэнне

*інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік*
*да 475-годдзя з часу першага згадвання*
*ў пісьмовых крыніцах вёсак Кобрынскага раёна*

## ЛЕЛІКАВА

ПАВІЦЦЕ




Кобрын
2021

УДК 016:911.373-908(476.7)
ББК 91.9:26.89(4Беи)
М18

Серыя заснавана ў 2007 годзе

***Складальнік***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

М18 **Малой радзімы прыцяжэнне** : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 475-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах вёсак **Лелікава**, Павіцце Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2021. – 90 с. : каляр. фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Малой радзімы прыцяжэнне» прысвечаны 475-годдзю з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах вёсак Лелікава, Павіцце Кобрынскага раёна. Выданне змяшчае значную інфармацыю аб надзвычай цікавых, унікальных вёсках-юбілярах, расказвае аб падзеях далёкага мінулага і тых, што яшчэ ў многіх у памяці, славутасцях, памятных мясцінах, традыцыях, вядомых земляках. Удакладняюць інфармацыю фотаздымкі з галерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, архіваў Лелікаўскай і Павіццеўскай публічных бібліятэк. У паказальніку шырока прадстаўлена бібліяграфія. Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, яго культурай, мовай, этнаграфіяй.

**УДК 016:911.373-908(476.7)**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2021

# ЗМЕСТ

ЛЕЛІКАВА: ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ 4

**Ад мінулага да сучаснасці** 5

*Гісторыя вёскі* 5

*Паходжанне назвы вёскі* 6

*Прыродныя ўмовы і рэсурсы* 7

*Носьбіты тараканскай гаворкі* 8

*Свята вёскі - незабыўны і ўрачысты дзень* 10

*Аб'ект спартыўнай гордасці лелікаўцаў* 12

*Школа імя Уладзіміра Шапецюка* 13

*Этнаграфія мясцовасці. Лелікаўскія абрады, народныя традыцыі і паданні* 16

ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ, СЛАВУТАСЦІ 19

*Помнік архітэктуры XVIII стагоддзя - Свята-Дзмітрыеўская царква* 19

*Помнік на ўшанаванне памяці 39 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну* 22

*Убор лелікаўскай свахі* 23

ГІСТОРЫЯ ВЁСКІ Ў АСОБАХ 26

СПІС КРЫНІЦ 33

СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік 42

# ЛЕЛІКАВА
# ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

*На свеце ёсць зямель багата,*
*Але што нам да іх красы?*
*Там лепей, родная дзе хата,*
*Знаёмы лес і верасы.*
*Плыве пах кветак і жывіцы,*
*Не сціхне песня салаўя.*
*Дазволь жа нізка пакланіцца,*
*Табе, бацькоўская зямля!*




***За гады свайго існавання вёска Лелікава перажыла розныя падзеі. Уваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, адчуваючы на сабе рэжым кожнай улады. Нягледзячы на «палітыку», якая праводзілася на тэрыторыі вёскі ў розны час, лелікаўцы змаглі захаваць свае традыцыі, абрады, што зарадзіліся тут адвеку. Адна знакамітая лелікаўская сваха чаго варта, касцюм якой у 2018 годзе ўнесены ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.***

***Лелікава - адна з тых мясцін, дзе занава пачынаеш спасцігаць сваю беларускую ўнікальнасць. Новае ўпэўнена зайшло сюды ў форме тэніснага корта, інтэрнэта, сайдынгу на дамах, але і старое з яго вышыванкамі, тканым палатном, касцюмам свахі не адпускае заваяваных пазіцый.***

# Ад мінулага да сучаснасці

## ***Гісторыя вёскі***

Гісторыя роднага краю – багацейшы выток пазнання гістарычных і геаграфічных з'яў, аснова для вывучэння гістарычнай спадчыны.

Лелікава (мясцовая назва Леліково) - вёска ў Дзівінскім сельсавеце Кобрынскага раёна, за 47 км ад раённага цэнтра Кобрына, 97 км ад абласнога цэнтра Брэста.

Вядома з XVI стагоддзя, упершыню ўпамінаецца ў 1546 годзе як вёска Лолікаўцы ў складзе Дзівінскай воласці Берасцейскага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1569 года - частка Рэчы Паспалітай, уваходзіла ў Ратненскі павет Каралеўства Польскага. У 1774 годзе Лелікава - маёнтак у Холмскай зямлі Рэчы Паспалітай.

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) - у складзе Расійскай імперыі, у Ковельскім павеце.

З 1883 года вёска - цэнтр Лелікаўскай воласці, у Ратненскай паліцэйскай акрузе. Побач знаходзіўся аднайменны фальварак, уладанне Быкоўскіх. Паводле мясцовых пераказаў, К. Быкоўскі, якога лелікаўцы дагэтуль завуць «окомун» (аканом), пасля скасавання прыгоннага права не паведамляў пра гэта сялянам, працягваў трымаць іх у залежнасці, быў вядомы сваёй сквапнасцю і жорсткасцю. Па яго загаду сялян быццам бы каралі смерцю. Месца, дзе гэта адбывалася, да сённяшняга часу мае назву «Шыбеніца». Каб скасаваць прыгон, зацвердзіць прадугледжаны новым законам парадак і прадухіліць самачынную расправу над К. Быкоўскім, павятовая ўлада быццам бы паслала ў Лелікава сотню казакаў, а самога К. Быкоўскага пазбавілі права на зямлю і выселілі з гэтых месцаў.

У XVIII стагоддзі ў вёсцы пабудавана драўляная Дзмітрыеўская царква.



З 1921 года вёска ў складзе Польшчы. У 1921-1926 гадах Лелікава - цэнтр гміны ў складзе Камень-Кашырскага павета Пале-скага ваяводства, з 1926 по 1939 год — Кобрынскага павета. На тэрыторыі гміны налічвалася 136 населеных пунктаў, 10372 жыхары, у вёсцы - 157 дамоў, 744 жыхары.

У 1930-я гады ў вёсцы працавалі школа, вячэрнія курсы, чытальня, тэатральны гурток.

З 1939 года вёска Лелікава сярод вызваленых раёнаў Заходняй Беларусі, якія далучыліся да БССР.

З 15 студзеня 1940 года - у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12 кастрычніка 1940 года да 16 ліпеня 1954 года - цэнтр Лелікаўскага сельсавета, потым у складзе Павіццеўскага, Дзівінскага сельсаветаў (1970).

У 1940 годзе ў вёсцы 266 двароў, 1294 жыхары, няпоўная сярэдняя і пачатковая школы, магазін, хата-чытальня, паштовае аддзяленне, сельсавет, медпункт, пажарнае дэпо, участкі лясгаса і леспрамгаса.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі (з чэрвеня 1941 года па ліпень 1944 года). У баях з ворагам загінулі 39 аднавяскоўцаў (у 1965 годзе на могілках устаноўлены абеліск). Пасля адыходу немцаў у ліпені 1944 года з-за вялікага ўплыву УПА сфарміраваць у Лелікаве сельскі Савет не было магчымасці. Для барацьбы з бандэраўцамі былі прыцягнуты буйныя сілы.

Паступова мірнае жыццё наладжвалася. У 1949 годзе 60 вясковых гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Чырвоная зорка».

Паводле перапісу 1959 года вёска налічвала 960 жыхароў, у 1970 годзе – 1084 жыхары, дзейнічала праўленне калгаса.

У сувязі з узбуйненнем раёнаў з 8 жніўня 1959 года вёска Лелікава ўвайшла ў склад Кобрынскага раёна.

У 1999 годзе налічвалася 354 гаспадаркі, 1064 жыхары, цэнтр калгаса «Чырвоная зорка». Працуюць магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі.

На 1 студзеня 1999 года ў вёсцы 354 двары, 1064 жыхары, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа.

Па стану на 1 студзеня 2007 года ў вёсцы пражывала 903 жыхары.

У апошні час назіраецца працэс скарачэння насельніцтва вёскі. У 2015 годзе колькасць насельніцтва ў вёсцы Лелікава складала 613 жыхароў.

2016 год – 586
2017 год – 549
2018 год – 518
2019 год – 464
2020 год – 450

Па стану на 1 студзеня 2021 года колькасць насельніцтва ў вёсцы складае 425 жыхароў. На жаль, Лелікава ў спісе тых вёсак Кобрынскага раёна, якія, як кажуць у народзе, выміраюць. Вёска пусцее, на вясковых вуліцах шмат хат, якія сіратліва пазіраюць на свет забітымі вокнамі і зачыненымі на замок дзвярамі. Асноўныя жыхары вёскі – пажылыя людзі. Але насельніцтва, якое тут жыве, клапоціцца аб дабрабыце, імкнецца захаваць сацыяльныя аб'екты ў сваёй вёсцы. З мясцовай інфраструктуры ў вёсцы - фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне паштовай сувязі, тры крамы, адна з іх прыватная, школа.

## *Паходжанне назвы вёскі*



Вёска мае сваё далёкае мінулае, якое, магчыма, дало ёй назву. Існуе шмат легенд пра паходжанне назвы Лелікава, якія людзі данеслі да нас, сучаснікаў.

Традыцыйнай лічыцца гіпотэза паходжання назвы ад украінскага слова «лелека», што значыць «бусел». У розных мясцінах беларускага Палесся бусла называюць лелькам. Вёска акружана мноствам балот, дзе сапраўдным гаспадаром была гэтая цудоўная птушка. Адсюль і ўтварылася назва паселішча — Лелікава — буслінае месца, вакол якога распрасцерліся лугі.

У першай пісьмовай крыніцы ў 1546 годзе сяло Лелікава згадваецца як Лолікаўцы. Жыхары суседніх вёсак гэта паселішча называлі Лолікі, Лалакэ, Лэлэкы. Называцца на расійскі манер «Лелікава» паселішча стала на расійскіх картах толькі пасля 1795 года. Але чырвонай ніткай праз стагоддзі праходзіць слова «лелека».

Яшчэ на пачатку 1960-х гадоў амаль на кожным доме або хляве ў вёсцы можна было ўбачыць буслінае гняздо. Паводле аповеду мясцовых старажылаў, спакон веку буслы і людзі жылі побач, амаль у кожнай сям'і была свая птушыная пара, якую чакалі з выраю, назіралі за гадаваннем птушанят, са смуткам праводзілі ў чужы край і зноў чакалі з надзеяй. Лічыцца, што пакрыўдзіць гэтую птушку — недаравальны грэх, за якім будзе непазбежнае пакаранне, а забіць яе — тое ж, што пазбавіць сябе анёла-ахоўніка. Паводле народных пераказаў, мясціны, дзе жывуць буслы, атулены Божай ласкай. Лелікава не абыходзілі нягоды, але штогод вясною белыя птушкі прыносілі добрую вестку — жыццё ідзе сваім вызначаным парадкам і дорыць радасць. Бусел назаўсёды застаўся сімвалам вёскі.

Другая версія сцвярджае, што вёска названа ў знак пашаны да старажытна-славянскага бога кахання Леля. Але жыхары Лелікава аддаюць перавагу першай версіі назвы, таму што ў памяці старых не захавалася ніякіх паданняў пра бога кахання Леля.

## ***Прыродныя ўмовы і рэсурсы***

Вёска Лелікава з яе ваколіцамі багата на водныя аб'екты. Усходнюю частку населеннага пункта перасякае Арэхаўскі канал, які бярэ пачатак на поўдні і ўпадае ў Дняпроўска-Бугскі канал. Таму і ўсходняя частка Лелікава, размешчаная за каналам, носіць назву «Замосце».




Левым прытокам Арэхаўскага канала з'яўляецца Лелікаўскі канал, які быў выкапаны як меліярацыйны (даўжыня 8,1 км) і Цера-бовіцкі канал, які бярэ свой пачатак з возера Церабовічы (даўжыня 14,3 км).

У паўднёва-заходняй частцы вёскі размешчана невялікае возера, якое носіць назву Свінарэйка. Плошча паверхні 0,18 км², даўжыня 0,53 км, шырыня 0,48 км. Даўжыня берагавой лініі 1,19 км. Найбольшая глыбіня 1,1 м, сярэдняя – 0,5 м. Дно сапрапелістае. На поўначы злучана меліярацыйным каналам з каналам Арэхаўскі. У возеры водзяцца шчупак, акунь, плотка, карась і іншыя віды рыб. Яно мелкаводнае, заўжды перапоўнена багавіннямі.



*Возера Свінарэйка*

Існуе паданне, што на тым месцы, дзе зараз возера, калісьці была раўніна, і там з'явілася нейкая расліна, корань якой аказаўся смачным для свіней. Яны так старанна рылі, дабываючы гэты корань, што спачатку з'явілася калюжа, затым брод, а пасля і возера. Адсюль і яго назва - «Свінарэйка».

Заходняя частка вёскі прымыкае да паласы лесу, паўднёвая частка якога называецца «Біркі», а паўночная - «Выркі». Дрэвы тут прадстаўлены наступнымі пародамі: сасна, бяроза, дуб, альха, ясень. У лесе ў асенні час растуць грыбы, ягады, на забалочаных тэрыторыях - клюква. Водзяцца дзікія козы, ласі, дзікі, барсукі, куніцы, выдры, лісіцы, зайцы, ваўкі.



Мясцовасць, у якой знаходзіцца вёска, у цэлым прадстаўляе суцэльную раўніну, толькі ў паўднёва-ўсходняй частцы вёскі ёсць нязначная пясчаная каса, пакрытая зараснікамі ядлоўца. На ёй размешчаны некалькі ўзгоркаў, самы высокі з якіх называецца «Каўтатая гара».

## ***Носьбіты тараканскай гаворкі***

Асаблівым гонарам вяскоўцаў з'яўляецца мова. Лелікава - адзіная вёска Кобрыншчыны, мова якой адносіцца да гэтак званых тараканскіх гаворак, названых так мовазнаўцам Фёдарам Клімчуком па назве вёскі Таракань Драгічынскага раёна (цяпер пераназвана ў Імянін), дзе ён упершыню запісаў іх. Паколькі населеныя пункты ў гэтай частцы Кобрыншчыны размешчаны адзін ад аднаго на вялікай адлегласці, а раней былі адмежаваны яшчэ і балотамі, то гэтая мясцовасць - класічны ўзор сцвярджэння, што на Палессі «што ні сяло, то іншая мова».

Мова жыхароў вёскі Лелікава значна адрозніваецца ад дыялектаў навакольных вёсак. Падобны дыялект можна пачуць толькі ў вёсцы Картэлісы Ратнеўскага раёна Валынскай вобласці Украіны ды яшчэ ў дзвюх-трох вёсках Брэсцкай вобласці.

Нягледзячы на магутны ўплыў чужых (афіцыйных) моў і дыялектаў у розныя перыяды гісторыі, лелікаўцы да сённяшняга часу захавалі свой дыялект, сваю моўную культуру, што сведчыць аб глыбокіх і моцных каранях самабытнасці жыхароў вёскі. Цяжка сказаць, да якой мовы яна набліжаецца па сваіх асаблівасцях, але тое, што ва ўжыванні яна прыярытэтная як для мясцовых жыхароў, так і для выхадцаў з вёскі, можна гаварыць упэўнена.

Да эвакуацыі жыхароў вёскі ў Расію, у час Першай сусветнай вайны, лелікаўцы ў сваёй мове не ўжывалі і не ведалі брыдкага рускага мата і другіх паганых лаянкавых слоў. Вярнуўшыся з Расіі, бежанцы прывезлі гэтае моўнае «багацце» і ў сваю родную вёску. Вось, напрыклад, якімі словамі абыходзіліся ў Лелікаве падчас лаянкі: «Чортэ проступэлэ в твого батька і твою матара» (чэрці пасяліліся ў твайго бацькі і тваёй маці), «Шчоб таба зголэло, шчоб таба шчэстыло» (каб ты застаўся голым, каб цябе ачысціла ад усёй маёмасці).

Прымаўкі і пагаворкі, абрадавыя песні, замовы і байкі, загадкі і легенды - уся творчасць моўнага багацця гэтага краю - запісваюцца па правілу «пішаш, як чуеш». «Загадэ за морам, а смарть за плачэма» (што ты загадваеш, яшчэ далёка-далёка, а вось калі памрэш невядома, можа і заўтра).

Калі хто з сям'і просіць бацьку ці маці купіць нешта, для яго не такое ўжо і неабходнае, то ў адказ можна пачуць: «Купэв бэ сало, но грошій голо».

Пра таго, хто вельмі перабірае дзяўчат і ніводная яму не падабаецца, кажуць: «З валэкого парабору той вэбрав засёру» (перабіраў-перабіраў ды ажаніўся на непрыгожай ды неахайнай, лянівай).

А вось як бацькі гаруюць аб сваёй бяспутнай ды гаротнай дачцэ: «В кого дочок сім, то ім і доля всім, а ў мана одно око, та і тоя глубоко».

Пра неахайных ды няўдалых такія прыказкі: «Пушла Гандзя жэто жетэ, та і забула сарпа взетэ, сарпа взела - хліб забула, такэ Гандзя вдома була», «Пастух - кіла згубэв кія, шукав кія - згубіў торбу, і до вачора слёзэ сёрбав», «Якэй йхав - таку і здэбав» (які сам неахайны, такую і жонку сабе ўзяў).

«Ек хоч сварэся, но свій свого даржэся», «Хто батька-матара паважея, таму бог віку прібавлея».

Папрок: «З пустоі байкэ ны прідбаяш майкэ» (не прыдбаеш маёмасці), «Хто пітая, той ны блудыть, Хто працюя, той ны нудыть».

На пытанне: «Що купэв на базарэ?» - адказ: «Вэтрэшчкэ і набічкэ» (нічога).

З пранікненнем у Лелікава цывілізацыі і з развіццём шляхоў зносін мясцовая мова пачынае асіміляваццa і губляць сваю непаўторнасць. Але аўтэнтычнасць мовы можна яшчэ адчуць у размове са старэйшымі людзьмі. Асабліва гэта тычыцца старых песень. Кожная пара года, кожнае свята мела свае песні. З імі сустракалі Каляды, гукалі вясну, шукалі на Купалле цудадзейную папараць-кветку. Народныя песні гучалі на радзінах, заручынах і вяселлях, на талоках, калі людзі збіраліся разам на працу.



## ***Свята вёскі - незабыўны і ўрачысты дзень***

Родная вёска… Якая яна? Самая прыгожая і самая жаданая. Родная вёска – гэта родны дом, карані, матуліна песня, шчырыя аднавяскоўцы. У Лелікаве заўсёды адзначаюцца святы вёскі, якія звычайна прымяркоўваюць да юбілейных дат. Гэтае свята збірае разам землякоў – прадстаўнікоў розных пакаленняў, людзей працавітых, дружных, натхнёных думкамі і справамі, прысвечанымі роднаму кутку.

Святы вёскі Лелікава ў 2003 годзе і 2006 годзе з’яўляюцца ўнікальнымі для Беларусі па маштабнасці, без прыцягнення бюджэтных сродкаў. Арганізаваны яны былі Іванам Паўлавічам Панасюком, грамадскім дзеячам беларускай дыяспары ў Расіі, мецэнатам, прадпрымальнікам з Новасібірска, ураджэнцам вёскі Лелікава. Дарэчы, Іван Паўлавіч лічыць родную вёску ўнікальнай сацыякультурнай з'явай, годнай даследаванняў этнографаў. У Івана Панасюка ёсць у вёсцы ўласная сядзіба, куды ён зрэдчас прыязджае на адпачынак.

У 2003 годзе ўрачыста адзначалася 460-годдзе з часу заснавання вёскі. На гэтым свяце былі песні, конкурсы, шанаванні лепшых, віншаванні і падарункі, а самы незвычайны - выступленне вядомага савецкага і беларускага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Гэта таксама быў падарунак Івана Панасюка сваім землякам. Невыпадкова, што той падзеі ў Лелікаве былі прысвечаны матэрыялы ў многіх выданнях, у тым ліку і такіх, як рэспубліканскія «Звязда», «Народная газета», а таксама «Голас Радзімы» (выдаецца для суайчыннікаў, якія жывуць за межамі Беларусі).



Старшыня Савета дырэктараў групы кампаніі “ Еўропа – Азія”, кіраўнік культурна – асветніцкага цэнтра імя Ефрасінні Полацкай ў Новасібірску, ураджэнец вёскі Лелікава Панасюк Іван Паўлавіч інаместнік старшыні Кобрынскага РВК Рагачук Аляксандр Сцяпанавіч перарэзваюць святочную стужку.





У час свята вёскі Лелікава на плошчы каля Дома культуры.



Святочпае шэсце па вуліцы Савецкай.



Дэгустацыя кулінарнага майстэрства.





Шэсце жыхароў вёскі, музыкантаў і гасцей па цэнтральнай вуліцы.

«…*Деньги можно проиграть в казино, можно съездить на Багамы и оставить там, можно купить замок за границей или, например, футбольный клуб. А можно потратить на то, что тебе действительно дорого, чему ты обязан в жизни – своей родной деревне. Я считаю, что должен своему Леликово. И я могу принести пользу тому месту, где я родился. А если я могу, то почему я не должен? Мне не раз приходилось слышать, что, мол, Леликово – это едва ли не край земли, глухая деревня, чего от леликовцев можно ждать? Обидно такое слышать о своей родине. А я всегда без стеснения всем говорю, что я родом из Леликово, и хочу, чтобы все мои земляки-односельчане с гордостью так говорили, и всё, что могу, делаю для этого, для своей родной деревни*», - так адказаў на пытанне аб будаўніцтве дарагога тэніснага корта ў невялікай аддаленай вёсцы зямляк і патрыёт Іван Панасюк.

## *Аб'ект спартыўнай гордасці лелікаўцаў*




Першае, што паведаміць вам інтэрнэт пра вёску Лелікава, - гэта тое, што тут ёсць сучасны тэнісны корт. З'ява і сапраўды ўнікальная. Ні адна вёска не толькі ў Беларусі, а, можа, і ва ўсім СНД не можа такім пахваліцца.

Адкрылі корт, які пабудаваў для сваіх землякоў на ўласныя сродкі Іван Панасюк, у жніўні 2006 года, і гэта была неардынарная падзея не толькі для раёна. Па сабе корт не вельмі вялікі цуд для гараджаніна, але знаходжанне яго ў глухой мясцовасці выглядае досыць экзатычна.

У дзень урачыстага адкрыцця гэтага спартыўнага збудавання якасць гульнявой пляцоўкі прыязджалі ацаніць вядомыя беларускія тэнісісты, у тым ліку Уладзімір Ваўчкоў, Вольга Барабаншчыкава, прадстаўнікі Беларускай асацыяцыі тэніса. Адбыліся таварыскія спаборніцтвы. Запрошаныя эксперты, госці былі аднадушныя: корт еўрапейскага ўзроўню, адпавядае ўсім міжнародным стандартам, можна тут праводзіць любыя спаборніцтвы.

Побач з кортам бізнесмен Панасюк уладкаваў сельскую сядзібу з гасцявым домам, дзе могуць спыняцца спартсмены і аматары тэніса для адпачынку ў вёсцы і заняткаў любімым відам спорту.



*«У меня друзья спрашивают, для чего в такой глуши я все это сделал, можно ведь было построить корт и усадьбу под Москвой, под Минском, да еще и прибыль получать. А здесь все абсолютно бесплатно. Просто хотелось, чтобы это было в моей родной деревне. Чтобы пацаны могли играть не только в футбол, но и в этот дорогущий вид спорта: чтобы у них были корт, ракетки, мячи и прочее. Мне искренне хотелось сделать для них недоступное доступным»*, - тлумачыць Іван Панасюк.

У вёсцы з кортам звязвалі вялікія надзеі, на яго базе планавалася адкрыць сельскую дзіцячую тэнісную школу, ладзіць спаборніцтвы, гадаваць новыя таленты. Акрамя таго, разлічвалі павысіць турыстычную прывабнасць сельскай глыбінкі.



Першыя шэсць гадоў тут сапраўды праводзіўся турнір «Буслік Палесся» - з цікавай праграмай і прызамі для юных тэнісістаў. Потым вёска, якая знаходзіцца ў 800 м ад беларуска-украінскай мяжы, трапіла ў памежную зону, з арганізацыяй турніру сталі ўзнікаць цяжкасці. У мясцовай школе таксама не знайшлося энтузіястаў, каб папулярызаваць гэты від спорту сярод навучэнцаў. Вось і атрымліваецца, што першакласны аб'ект выкарыстоўваецца далёка не ў поўнай меры…

## ***Школа імя Уладзіміра Шапецюка***



У канцы XIX стагоддзя ў вёсцы Лелікава працавала царкоўна-прыхадская школа. Спецыяльны драўляны будынак школы пабудаваны ў 1900 годзе. Школа была

аднакласная, з трох груп. У трэцяй групе вывучалі такія прадметы, як арыфметыка, руская граматыка, рускае слова, Закон божы, псалтыр, часаслоў. Вучні пасля заканчэння трэцяй групы здавалі выпускныя экзамены. Дзяўчынак у школе было зусім мала, а усяго ў групах займалася ад 25 да 30 чалавек.

У 1908 годзе ў Лелікаве быў узведзены новы драўляны будынак школы плошчай 104 кв. м.

У перыяд Першай сусветнай і грамадзянскай войн школа не працавала. Заходнія землі Беларусі знаходзіліся пад уладай Польшчы.

У 1928 годзе з мэтай паступовага акаталічвання беларусаў у вёсцы адкрыта школа з польскай мовай навучання. Гэта ўжо была чатырохкласная школа. Вучоба і выхаванне дзяцей былі заснаваны на палачнай дысцыпліне.

Перад Другой сусветнай вайной у школе адкрыта пяць класаў, у асноўным наведвалі школу хлопчыкі.

З верасня 1939 года ў вёсцы пачала дзейнічаць школа-сямігодка, у якой выкладанне вялося на беларускай мове.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Лелікаўская сямігадовая школа не працавала. Так працягвалася да вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З 1944 года школа аднавіла работу. Пачатковая школа размяшчалася ў драўляным будынку. Заняткі праходзілі ў дзве змены. Першымі настаўнікамі ў пасляваенны час былі Аляксандр Афанасьевіч Свідуновіч, Аркадзій Андрэевіч Кірылюк, Рыгор Сямёнавіч Ногач; першай піянерважатай - Марыя Іванаўна Кіцель.

У 1949 годзе школа зноў набыла статус сямігадовай, з 1962 года - васьмігадовай. У 1969 годзе ўстанова атрымала статус сярэдняй. Заняткі праводзіліся ў дзве змены.

Для тых, хто не мог наведваць дзённую школу, пачала працаваць вячэрняя школа, якая праіснавала да 1990 года. Памяшканне школы было малым. Нават два класы размяшчаліся ў наёмным памяшканні мясцовага жыхара Піліпа Якаўлевіча Паплаўскага, дом якога знаходзіўся ў цэнтры вёскі.

У 1969 годзе пачалося будаўніцтва новага двухпавярховага будынка школы на 450 пасадачных месцаў. Будаўніцтва ішло хуткімі тэмпамі, і ўжо ў 1971 годзе новае памяшканне было ўведзена ў строй. Першым дырэктарам школы стаў Фёдар Майсеевіч Кот.

У 70-я гады школа адной з першых у раёне перайшла на кабінетную сістэму. Ініцыятарам увядзення кабінетнай сістэмы ў навучальны працэс быў дырэктар школы Юрый Аляксандравіч Іваноў. У школе тады налічвалася 437 вучняў.

У 80-я гады класныя кіраўнікі вялі вялікую работу па патрыятычным выхаванні вучняў. Быў сфарміраваны атрад «Пошук», які складаўся з вучняў 7 класаў, правялі значную пошукавую работу, вынікам якой з’явілася ўстанаўленне імён двух партызан і перапахаванне іх астанкаў каля абеліска.

У 1988 годзе піянерскаму атраду вучняў 4 класа было прысвоена імя Уладзіміра Шапецюка, воіна-афганца, выпускніка школы 1975 года, які праявіў мужнасць і гераізм пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане.

У 1991 годзе школа адзначала свае 20-годдзе. Асноўным напрамкам выхаваўчай работы ў гэты час стала краязнаўства. Кіраўніцтва гэтай работай здзяйсняў настаўнік геаграфіі Уладзімір Паўлавіч Сальянчук.

У 1995 годзе быў пакладзены пачатак традыцыі штогадовага ўшаноўвання памяці Уладзіміра Шапецюка. З 2003 года пад кіраўніцтвам Ганны Адамаўны Панасюк, намесніка дырэктара школы, работа ў гэтым напрамку стала праводзіцца сістэмна і мэтанакіравана.

Калектывам школы прынята рашэнне аб стварэнні пакоя славы, дзе цэнтральную экспазіцыю вырашана прысвяціць землякам-афганцам і, вядома ж, Уладзіміру Шапецюку. На сённяшні дзень ёсць звесткі і фотаздымкі аб 16 выпускніках школы, якія прынялі ўдзел у афганскіх падзеях.

Шмат было зроблена ў гэтым напрамку педагагічным калектывам і вучнямі школы. Як вынік работы - прысваенне Лелікаўскай сярэдняй школе імя Уладзіміра Шапецюка (рашэнне раённай тапанімічнай камісіі № 5 ад 31 сакавіка 2006 года, рашэнне Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта № 387 ад 2 ліпеня 2006 года).

З верасня 2021 года Лелікаўская школа стала базавай. Школа сёння – гэта 22 навучэнцы, 7 класаў-камплектаў. У школе 16 навучальных кабінетаў, бібліятэка, вучэбна-вытворчыя майстэрні, гімнастычны гарадок, пляцоўкі для валейбола і баскетбола, спартыўная зала.

Гонарам школы з’яўляецца этнаграфічны музей «Спадчына», які размясціўся ў невялікім пакоі і ўяўляе фрагмент сялянскай хаты. Разнастайныя прадметы хатняга побыту, посуд, дапаможны інвентар, мэбля, адзенне займаюць у сістэме інтэр'еру сваё месца і ствараюць асаблівы мікраклімат, які дазваляе максімальна наблізіцца да культуры нашых продкаў. У музеі знаходзяцца 122 экспанаты асноўнага фонду і 10 экспанатаў дапаможнага фонду.







## *Этнаграфія мясцовасці. Лелікаўскія абрады, народныя традыцыі і паданні*



Міфалагічная прастора мясцовага краю насычана легендамі пра паходжанне дыялектаў, назваў мясцовых урочышчаў, пра вясельную сваху з платам. Усё гэта з'яўляецца прыкладам існавання аўтэнтычнага міфалагічнага ландшафту, у якім адлюстроўваюцца традыцыі пэўнага перыяду гісторыі і культуры беларускага народа.

Пра назвы ўрочышчаў у наваколлі вёскі Лелікава вядома не так многа, але назвы гавораць самі за сябе. Тыя, што захаваліся да нашага часу, сведчаць аб розных старонках жыцця продкаў: Бортнічы, Лінец, Смолянка, Муравінец, Ляда, Шпалец, Снэкі, Маршава, Ночкі, Рачок, Хабішча, Татарскае...

*Бортнічы* - пясчанае ўрочышча, назва якога паходзіць ад слова «борць». Борць - гэта дупло ці калода, вулей, дзе пчолы назапашвалі мёд. Калісьці на гэтым узгорку рос магутны лес, у дуплах дрэў якога жыхары вёскі здабывалі мёд, а пазней і самі ставілі калоды на дрэвы і засялялі іх пчалінымі сем'ямі.

Аб *Татарскім* існуе такое паданне. Невялікі атрад татарскіх коннікаў-разведчыкаў Батыя заблудзіўся ў лелікаўскіх лясах і балотах і быў знішчаны мясцовымі жыхарамі. Вось адсюль і назва, а ад татарскіх коней пайшлі мясцовыя - невялічкія, але вельмі вынослівыя.

*Хабішча* — ад славянскага слова «хабы», якое азначае топкае балота, дрыгву.

*Гусёнка* — мясціна, на якой выводзіліся дзікія гусі, якія кармілі жыхароў яйкамі і мясам.

Назва лугавіны *Урічʼе* сведчыць аб тым, што па той лугавіне працякала ціхая рачушка, якая перасохла і зарасла дзякуючы выкапанаму ў сярэдзіне XIX стагоддзя Арэхаўскаму каналу. Выходзіць канал з возера Гнілы або Малы Арэхавец, што на тэрыторыі Украіны.

Каля Лелікава ёсць мясціна пад назваю *Кут.* Раней размешчаныя тут зямельныя пляцы належалі святару («папу») і дзяку і на мясцовым дыялекце называліся «Попівшчына» і «Дяківшчына».

Сённяшнюю вуліцу Новую ў даўнія часы называлі Млыновай дарогай, напрыканцы якой на курганістым узвышшы стаяў млын-вятрак. Паводле мясцовага падання, яшчэ раней на гэтым месцы стаяла першая Лелікаўская царква ці капліца.

У пачатку XX стагоддзя ў вёсцы ў асноўным былі курныя хаты. Мэбляй у такіх хатах служылі дошкі-лаўкі, якія стаялі на калодках пад сценамі, а ў запеччы - тры дошкі разам - «прымост» для спання і столік.



Адзеннем у той час служыла саматканае палатно і сукно, абуткам - самаробныя лапці з лазы. Расказваюць, што на ўсё сяло існавала адна пара ботаў, якія надзяваў адзін толькі раз жаніх, калі ішоў пад вянец. Адзенне мужчыны складалася з латухі, халстовых рубах, верхняй і споднай, такіх жа штаноў і кажуха, а абуткам заўжды служылі лапці. Жанчыны таксама надзявалі латуху, палатняную кофту і такую ж спадніцу, якая называлася фартух, і такі ж пярэднік, які называлі «затулка», а абуткам у жанчын таксама служылі лапці.

Асноўным харчаваннем насельніцтва былі бульба, хлеб, мучныя і малочныя вырабы; мяса і сала ўжываліся рэдка.



Вышыўка і ткацтва Марчук Марыі Сцяпанаўны і Ногач Марыі Піліпаўны.

XX стагоддзе істотна змяніла быт лелікаўскіх сялян. На змену курным хатам прыйшлі сялянскія домікі.

Цікава праходзіла лелікаўская жаніцьба. Сватала нявесту маці жаніха, а пры жаданні ўзяць у дом «прымака» сватала маці нявесты. Пры згодзе ва ўмоўны дзень збіралі запоіны. Гарэлку прыносіў жаніх, закуску рыхтавалі ў доме нявесты. Нявесту апраналі ў вясельны ўбор пасярэдзіне хаты, пасадзіўшы на дзежу (ёмістасць, у якой мясілі хлеб) у знак доказу яе нявіннасці.

На Калядкі ў вёсцы амаль не спяваюць, а толькі ў сачэльнік вечарам малыя дзеці ходзяць пад вокнамі хат і калядуюць:

Богат, багат, багатнэк,
Дай дядэнко каляднэк.
Заспівають тетеры,
Шчоб дождалы вечоры.

Гэта паўтараюць два ці некалькі разоў, да той пары, пакуль гаспадыня не прынясе каляднік.

Канун Новага года называюць Шчадрухай. І тады вечарам вяскоўцы ходзяць па хатах, пераапранутыя ў выглядзе цыган. У дом заходзяць без дазволу, танцуюць, паказваюць розныя цыганскія фокусы, і за гэта ім плацяць гаспадары дома грашыма або

прадуктамі. Акрамя «цыган» ходзяць хлопчыкі з «казой». Яны маюць добра вырабленую галаву казы з рожкамі, прымацаванымі да палкі. Хлопчыку даюць у рукі гэтую палку, накрываюць яго прасцінай так, што атрымліваецца падабенства дзікай казы. Зайшоўшы ў дом з «казой», яны спяваюць спачатку рэлігійную калядку, а потым спецыяльную песню для «казы». І ў гэты ж час «каза» танцуе па хаце:

Скакала коза
По лісам, горам.
А тапар скача
Па Божым домам.
Дэ коза ходыть
Гарне жыто родыть.
Дэ коза носкаче
Там ніхто не плаче.
Глянь, козуню, до печкі
Пече баба пірожкі
Які ж воно ячны
Для козуні смачны.

І калі гаспадары расплацяцца грашыма або піражкамі, «каза» нізка кланяецца гаспадару, гаспадыні і пакідае хату.

На другі і трэці дзень Ражства хлопцы ідуць калядаваць «на царкву». Бяруць у царкве кружку, у якую кідаюць грошы. Збіраюць таксама хлеб, сала, ягады і іншае. У карысць царквы заставаліся толькі грошы, астатняе - каляднікам за працу.

«Крінка» - характэрны старажытны абрад на першы дзень Троіцы. Дзеці, падлеткі адзяваюць адну дзяўчынку ў вясельны ўбор як нявесту і вядуць яе ў поле, напяваючы вясельныя напевы: «Ведемо Крінку за пацьорінку». У полі знаходзяць цяністае дрэва і танцуюць там да вечару, як бы гуляючы вяселле. Крыніца ўзнікнення гэтага абраду не ўстаноўлена.





# ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ, СЛАВУТАСЦІ

***Помнік архітэктуры - Свята-Дзмітрыеўская царква***




Свята-Дзмітрыеўская царква - помнік драўлянага дойлідства. Знаходзіцца на ўсходняй ускраіне вёскі Лелікава. Пабудавана, як сцвярджаюць старажылы, без адзінага цвіка.

Царква захавала ў сваім абліччы архаічныя рысы, характэрныя для больш ранняга перыяду XVIII стагоддзя: выцягнутая прамавугольная канструкцыя зальнага тыпу мае высокія сцены з высока размешчанымі на іх невялікімі вокнамі, канструкцыю завяршае прамавугольная алтарная частка, што таксама з’яўляецца прыкметай архітэктурнай архаікі. Наяўнасць гэтых стылістычных рыс дае падставу адносіць помнік да першай паловы — сярэдзіны XVIII стагоддзя. Сёння датаванне шматлікіх драўляных культавых помнікаў з’яўляецца прыблізным, і Лелікаўскі царкоўны ансамбль у гэтым сэнсе не выключэнне.

Лелікаўская царква будавалася як уніяцкая, у 1837 годзе ў адміністрацыйных адносінах належала Ратненскаму ўніяцкаму дэканату Падольскай губерні, мела 625 вернікаў, гадавы прыбытак складаў 36 рублёў срэбрам. Апошнім уніяцкім святаром-адміністратарам тут быў Аксенцій Пашкевіч, які даў пісьмовую згоду на далучэнне да праваслаўя.

У 1837 годзе на сродкі мясцовага землеўладальніка Канстанціна Быкоўскага святыню рамантавалі. У 1875 годзе рабілася чарговая рэпарацыя на сродкі вернікаў (1500 руб.): падкладзены каменны фундамент, зроблены новыя падлога і столь, пакладзены новы гонтавы дах, пастаўлены новыя іканастас і прастол, прыбудаваны прытвор і рызніца. На сярэдзіне царкоўнага даху з’явілася на адносна высокім двух’ярусным васьмерыку цыбулістая галава ў «рускім стылі» замест вежкі ў цэнтры даху — форме,

неўласцівай палескаму дойлідству.

Святарскім адзеннем і кнігамі царква была бедная. У ёй захоўвалася невялікая рукапісная Каляровая Трыёдзь у аркуш з надпісам на апошнім аркушы кінавар'ю «*Сию книгу написал Иеромонах Стефан Ольшевский, чину Св. Василия Великаго в обители Тараканской. Року 1743 мца априля 25*», копіі метрычных кніг з лістапада 1773 года, вопісы маёмасці за 1847 і 1885 гады, кліравыя ведамасці. Да 1830 года царква з'яўлялася філіяльнай і знаходзілася пад апекай святароў з суседніх вёсак.

Праз нясплочаную пазыку ад К. Быкоўскага маёнтак перайшоў да Ковельскай дваранскай апекі і быў аддадзены ў арэнду. Прыбытак ад арэнды не пакрываў выдаткаў, таму ў 1891 годзе зямля адышла ва ўласнасць дзяржаўнага скарбу.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны, каб не дапусціць да вывазу ў Нямеччыну, вернікі знялі і затапілі ў Свендражы вялікі звон. Яго гучны і прыгожы голас чулі за сем кіламетраў у Дзівіне — ён быў выліты са сплаву медзі і срэбра.

У царкве знаходзіцца мясцова-шанаваны абраз Маці Божай Пачаеўскай. Абапал яе



выявы адлюстраваны мучаніца Таццяна, пакутніца Кацярына, мучанік Міна, святыя Стафан і Аўраамій. Абраз змешчаны ў драўляную аправу. Ікона была замоўлена ў Пачаеўскай лаўры на сродкі, дасланыя мясцовым жыхаром Якавам Андрэевічам Паплаўскім (1875 - ?), які ў пачатку XX стагоддзя выехаў у Аргенціну. У 1911 годзе на працягу месяца абраз неслі ў родную царкву чатыры пешыя паломніцы, імёны якіх не забыты да сённяшняга дня — гэта Макрына і Юлія Трубчык, Варвара і Юлія Шапяцюк.

У 1959 годзе ваяўнічыя атэісты ўламіліся ў храм, загрузілі ў машыну царкоўнае начынне, абразы, дакументы, іншую маёмасць і павезлі ў царкву суседняй вёскі Павіцце. Па дарозе расцерушыліся царкоўныя паперы, якія пазней знаходзілі людзі. У гэты час большая частка царкоўнага архіва была знішчана. У 1989 годзе з Павіцця вярнулася толькі адна метрычная кніга за 1930-я гады. З машыны выпаў стары абраз Дзмітрыя Салунскага. Яго знайшла жыхарка Павіцця, захоўвала некалькі дзесяцігоддзяў і, паміраючы, прасіла вярнуць у Лелікаўскую царкву, што і было выканана яе дзецьмі. 20 снежня 1962 года мясцовае рэлігійнае аб'яднанне знялі з рэгістрацыі ў сувязі з яго далучэннем да прыходу ў Дзівіне. Свята-Дзмітрыеўскую царкву закрылі нібыта па прычыне яе дрэннага тэхнічнага стану. Абраз Божай Маці Пачаеўскай лелікаўцы патаемна захоўвалі некалькі дзесяцігоддзяў, ноччу передаючы з дому ў дом.

Дзякуючы клопату вернікаў і кіраўніку калгаса «Чырвоная зорка» Якаву Старжынскаму ў 1989 годзе былі закончаны рамонтна-аднаўленчыя работы царквы. З даўніх абразоў у царкву вярнуліся дзве старажытныя выявы на дрэве — Збавіцеля і Дзмітрыя Салунскага (абедзве памерамі 1х0,8 м). У 1990 годзе храм асвяцілі нанава.

Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

11 сакавіка 2019 года ў царкве здарыўся пажар (паводле версіі, праз электраправодку), які практычна знішчыў культавы будынак. Агнём знішчаны дах на плошчы 75 кв. м, пашкоджаны сцены і маёмасць. У выніку пажару згарэў і значны для храма Спіс Пачаеўскай іконы Божай Маці. Знайшлі на папялішчы толькі накідку з


Хрэсны ход у Свята – Дзімітрыеўскай царкве.

Пачаеўскай Лаўры і вышытую закладку ў Біблію.

А перад гэтай бядой як раз завяршыліся работы па добраўпарадкаванні царквы і прылеглай тэрыторыі. На працягу некалькіх гадоў мясцовыя жыхары ахвяравалі грошы, набывалі матэрыялы, працавалі на аб'екце. Дапамаглі матэрыяльна і зямлякі, якія цяпер жывуць у іншых краінах. Гэта Іван Іванавіч Губар і Іван Паўлавіч Панасюк.

Зараз набажэнствы ў вёсцы праводзяць у адным з пустуючых дамоў. Адносна будучага храма людзі знаходзяцца ў недасведчанасці. Яны не ведаюць, што рабіць: рэстаўрыраваць царкву ці будаваць нанова. «Без Царквы нікуды, страцілі мы такую вялікую сваю любоў, святыню», - смуткуюць жыхары вёскі Лелікава.

Агонь знішчыў святыню. Ацалела толькі 15% таго, што нядаўна было цэнтрам духоўнага жыцця вёскі. Але вяскоўцы спадзяюцца, што аднаўленне храма — пытанне бліжэйшага будучага.

Хочацца верыць, што знойдзеныя на папялішчы рэліквіі ўсё ж вернуцца ў храм, а гісторыя яго адраджэння будзе перадавацца ў Лелікаве з пакалення ў пакаленне.



**Малітоўны дом Евангельскіх хрысціян-баптыстаў**

У 1921 годзе з бежанства з Калугі ў Кобрын вярнуўся малады чалавек Георгій Сацэвіч. Менавіта ён на Кобрыншчыне стаў збіраць групы вернікаў для вывучэння Бібліі і пакланення Богу. Ужо ў 1926 годзе царква евангельскіх хрысціян-баптыстаў пачала выдаваць часопіс «Хрысціянскі Саюз».



Прыкладна ў гэты час утварылася царква евангельскіх хрысціян-баптыстаў і ў Лелікаве. Збіраліся на хаце. З прыходам Савецкай улады ў 1939 годзе зборы евангельскіх хрысціян-баптыстаў забаранілі. Падчас фашысцкай акупацыі сустрэчы аднавіліся.

У 90-я гады ў вёсцы пасля 30-гадовага забыцця аднавіла сваю дзейнасць праваслаўная Дзмітрыеўская царква, пачалося будаўніцтва новага будынка царквы евангельскіх хрысціян-баптыстаў.

Сёння Лелікаўскі малітоўны дом наведваюць каля 30 чалавек.

## *Помнік гісторыі*

**Помнік на ўшанаванне памяці 39 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну**

Помнік землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, знаходзіцца ў цэнтры вёскі. Пабудаваны для ўвекавечання памяці 39 аднавяскоўцаў.



## Старажытныя магільнікі

У канцы XIX - пачатку XX стагоддзя на месцы, дзе стаіць вёска, і ў яе наваколлі вучонымі-археолагамі знойдзены і раскапаны старажытныя магільнікі, у якіх было выяўлена падлубачнае захаванне старажытных людзей III-II стагоддзяў да н. э. Падлубачнае захаванне рабілі ўсходнеславянскія плямёны. Памерлага спальвалі на вогнішчы, а попел клалі ў выдаўбанае з дубу карытца і такім жа накрывалі, потым закопвалі. Такім чынам, раскопаныя археолагамі магільнікі сведчаць аб тым, што на месцы, дзе размяшчана цяперашняе Лелікава, людзі жылі яшчэ ў III-II стагоддзях да нашай эры.

## Убор лелікаўскай свахі

Яркім доказам таго, што вяскоўцы заўсёды заставаліся вернымі сваёй культуры, з'яўляецца наяўнасць у мястэчку каштоўнага здабытку - касцюма лелікаўскай свахі, які ўнесены ў спіс аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.



Народны касцюм - найбольш каштоўная і самабытная частка мастацкай спадчыны нашага народа. Да сярэдзіны XX стагоддзя ўбор свахі існаваў у арыгінальным выглядзе. Ён вырабляўся спецыяльна да вяселля і потым захоўваўся амаль у кожнай сям'і, асабліва там, дзе былі маладыя дзяўчаты.

Касцюм свахі - гэта своеасаблівая візітная картка ўсяго Кобрынскага раёна. З аднаго боку, гэта тыповы народны строй, які складаецца з кашулі, спадніцы, фартуха. З другога боку, касцюм адрозніваецца павышанай дэкаратыўнасцю, адмысловым галаўным уборам. На Кобрыншчыне да сённяшняга дня захавалася традыцыя вырабу старадаўняга жаночага строю свахі, якую ў 2018 годзе вылучылі як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь пад назвай *«Традыцыі вырабу і выкарыстання ўбору лелікаўскай свахі ў вёсках Лелікава і Павіцце»*.

Дакладны час узнікнення традыцыі невядомы, але сучасныя носьбіты адзначаюць, што строй лелікаўскай свахі выраблялі і выкарыстоўвалі яшчэ іх прабабкі. Такі касцюм апранала сваха, якая кіравала вяселлем, а таксама маладыя жанчыны і нават дзяўчынкі-падлеткі з роду жаніха - свашкі. Сваха выконвала асаблівую ролю на лелікаўскім вяселлі. Слова «сваха» ў мясцовым разуменні ўжываецца як «баявая сяброўка» жаніха ў вясельным абрадзе. Звычайна на вяселлі былі старэйшая сваха і свашкі. Старэйшай свахай выбіралі родную сястру ці родную цётку жаніха. Яна выконвала галоўную ролю, сачыла за паслядоўнасцю вясельных абрадаў, удакладняла іх пачатак і завяршэнне, удзельнічала ў галоўных момантах вяселля. Свашкі па чарзе спявалі прыпеўкі і танцавалі. Свах на вяселлі павінна было быць не менш пяці-сямі, а самыя багатыя жаніхі запрашалі нават да 15 свах.

Свахі заўжды былі жанчынамі вясёлымі і даволі доўга рыхтаваліся да вяселля. Каб з гумарам, з кпінамі прыдумаць цікавыя прыпеўкі пра кожнага госця і жаніха, загадзя даведваліся пра іх асаблівасці. Свахі ведалі шмат песень, забаў, прыпевак, жартаў, таму лёгка стваралі вясёлы настрой гасцям, уключалі іх у вірлівае вясельнае свята. А паколькі вяселлі раней звычайна доўжыліся цэлы тыдзень, яны ўяўлялі сабой цікавае відовішча і запамінальную вясковую падзею.

Касцюм свахі адрозніваецца павышанай дэкаратыўнасцю. Усе часткі касцюма пашыты з бавоўняных тканін і багата аздоблены аплікацыяй. На кашулі, спадніцы і фартуху нашыты арнамент з элементамі ў выглядзе вока - ланцужкі з закругленых ромбаў. У сярэдзіне ромбаў вышыты васьмікутныя зоркі. Касцюм шылі «з вачыма», бо сваха кіравала ўсім працэсам вяселля, таму павінна была добра ведаць вясельны абрад і

ўсё бачыць - адсюль вочы на касцюме. Гэтыя зоркі-вочы таксама засцерагалі маладых ад сурокаў.

Самай яркай дэталлю касцюма з'яўляецца незвычайны галаўны ўбор, які складаецца з плата і стракатай кароны з паліхромных стужак і ўпрыгожаны рознакаляровым пер'ем пеўня, што падкрэслівае баявы дух свацці, сваячкі жаніха.



З матэрыялаў навуковых даследаванняў вядома, што ў пачатку XX стагоддзя ўбор свахі з вёскі Лелікава адпавядаў строям замужніх жанчын Кобрыншчыны: ільняная сарочка, спадніца (ільняны «палатнянык» або шарсцяны андарак), фартух, тканы пояс з падоўжна-паласатым арнаментам. Адзенне звычайна шылася ўручную з натуральных матэрыялаў.

У 30-40-я гады XX стагоддзя ва ўбранні лелікаўскай свахі адбыліся змены. Паступова знікаюць тканыя і вышытыя элементы. Традыцыйныя ткацкія прыёмы і тэхніка вышыўкі ва ўпрыгожванні фартуха, кашулі, спадніцы заменены аплікацыяй, каляровым сацінам, атласнымі стужкамі і вышыўкай машынным радком. Значна зменшылася прапорцыя белага колеру, узмацнілася роля паласы ў мастацкім аздабленні. Прапарцыянальна павялічылася колькасць чырвонага колеру і яго адценняў, самастойнае гучанне набылі чорны і сіні колеры. З'явіліся адметныя арнаментальныя элементы («вочы»). У выніку, убранне свахі ўжо адрозніваецца ад звычайнага святочнага кобрынскага строю іншым мастацка-пластычным і каларыстычным вырашэннем, вылучаецца сваёй павышанай дэкаратыўнасцю.

У сучасны перыяд усе часткі строю шыюцца з фабрычных баваўняных тканін – паркалю, саціну і багата ўпрыгожваюцца аплікацыяй з рознакаляровых стужак і тканін. На рукавах, манішцы сарочкі, на фартуху нашываюцца «вочы» – ланцужкі з закругленых ромбаў чырвонага колеру. Ромб у народнай сімволіцы – сімвал зямлі, плоднасці. У сярэдзіне ромбаў выразаюцца кружкі і на іх белым фоне чорнымі ніткамі вышываюцца васьмівугольныя зоркі. Васьмівугольная зорка – вобраз чалавека, сімвалізуе і мужчынскі пачатак.

Спадніца бліжэй да пояса абшываецца шырокімі каляровымі стужкамі, унізе – больш вузкімі. Спадніца і фартух складваюцца па шырокіх падоўжных складках, апрацоўваюцца прасам, а потым звязваюцца ў некалькіх месцах і ў такім выглядзе захоўваюцца. Абуваецца сваха ў чаравічкі на абцасах, абавязкова з падкоўкамі, каб гучна прытопваць і прыстукваць у час танцаў і скокаў.

Адной з адметнасцей касцюма свахі, па-ранейшаму, застаецца галаўны ўбор. Старажытны спосаб камплектавання галаўнога ўбору свахі ў вёсцы Лелікава не захаваўся. Найбольш традыцыйным і правільным можна лічыць спосаб камплектацыі галаўнога ўбору з вёскі Павіцце, які знаходзіцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры

(г. Мінск). Галаўны ўбор выраблены ў 1934 годзе Марыяй Мікалаеўнай Радыванюк з Павіцця Кобрынскага раёна. Ніжняй яго часткай з'яўляецца лубяная «каробачка», якая надзявалася на прычоску. Зверху завіваўся плат. Паверх плата (па форме «каробачкі») павязваліся «брыжы» – асобны кампанент убору са сшытых паміж сабой палос рознакаляровай тканіны і стужак, упрыгожаны пацеркамі і бісерам. «Брыжы» завязваліся ззаду прышытымі да іх вузкімі тасёмкамі. Па вуглах «брыжоў» з унутранага боку прышыты пучкі рознакаляровых пер'яў, якія называюцца «пава» ці «рожкі». Плат не прышываўся ні да «каробачкі» ні да «брыжоў», у завітым выглядзе ён замацоўваў на галаве «каробачку».

Сучасны варыянт вырабу і камплектавання галаўнога ўбору свахі прадэманстравала галоўная захавальніца старажытнай традыцыі Анастасія Шапяцюк з вёскі Лелікава ў час фальклорнай экспедыцыі ў красавіку 2017 года. У гэтым варыянце плат абвіваецца вакол каробачкі і замацоўваецца з дапамогай нітак і іголкі. Дарэчы, Анастасія Ігнацьеўна 30 гадоў назад пашыла касцюм сабе, а зараз шые для ўнучак.

Сведчаннем значнасці і цікавасці да элемента з'яўляецца тое, што пытанні ўбрання лелікаўскай свахі Кобрынскага раёна неаднаразова вывучаліся даследчыкамі М. Раманюком (1981), М. Віннікавай (1999), Н. Жабінскай (2002), В. Багачовай (2009). Праведзеныя этнаграфічныя экспедыцыі навукоўцаў і работнікаў культуры Кобрыншчыны паказалі зацікаўленасць мясцовай супольнасці ў захаванні і папулярызацыі элемента, перадачы яго моладзі.

Жыхары вёсак Лелікава і Павіцце ўсведамляюць каштоўнасць элемента ў якасці культурнай спадчыны і праводзяць вялікую работу па зберажэнні і папулярызацыі строю. Традыцыі вырабу і выкарыстання строю лелікаўскай свахі перадаюцца з пакалення ў пакаленне. У наш час жыхаркі Лелікава і Павіцця вырабляюць строй лелікаўскай свахі на ўзорах, якія засталіся ад матуль і бабуль. Камплекты адзення захоўваюцца не толькі ў прыватных калекцыях жыхароў вёсак, але і ў этнаграфічным музеі «Палешукі» Павіццеўскай школы, у Дзівінскім Доме рамёстваў. Уплыў элемента на культуру раёна знайшоў водгук у творчасці мясцовых паэтаў і фальклорных калектываў, у рабоце Дзівінскага Дома рамёстваў. У апошнія гады традыцыю яго выкарыстання сталі адраджаць на сучасных вяселлях Кобрынскага раёна.

На сучасных лелікаўскіх вяселлях строй свахі выкарыстоўваецца вельмі рэдка. Лелікаўцы апранаюць гэты ўбор у час святаў і фестываляў традыцыйнай культуры, на святы і вечарыны фальклору, святы вёскі. Пераемнасць традыцыі вырабу і выкарыстання строю лелікаўскай свахі назіраецца ў тым, што яго дэманструюць як носьбіты традыцыйнай культуры, так і маладое пакаленне жыхароў вёсак Лелікава і Павіцце, аб чым сведчаць шматлікія прыклады выкарыстання строю.



Добра, што касцюм жыве, і звычаі яго стварэння захаваліся да нашых дзён. Элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца адной з адметнасцей Кобрыншчыны, яскрава характарызуе гістарычны, этнаграфічны, моўны ландшафт рэгіёна. Яго можна лічыць цікавай культурнай з'явай не толькі для мясцовай супольнасці, але і для насельніцтва іншых рэгіёнаў краіны і беларусаў замежжа.

# ГІСТОРЫЯ ВЁСКІ Ў АСОБАХ

Сёння і ва ўсе часы галоўнае багацце вёскі – гэта людзі.

***В я д о м ы я   з е м л я к і***

**ГУБАР Іван Іванавіч**. Нарадзіўся 14 лістапада 1962 года ў вёсцы Лелікава.



Бацька Іван Васільевіч быў лесніком, маці Ганна Сцяпанаўна працавала ў калгасе «Чырвоная зорка». У сям'і было пяць дзяцей, старэйшы – Іван.

У 1980 годзе Іван Губар закончыў Лелікаўскую сярэднюю школу. Не хапіла аднаго бала для паступлення на гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Але Іван застаецца ў Маскве, працуе вадзіцелем і паступае на вячэрняе аддзяленне Маскоўскага аўтамеханічнага інстытута. Паралельна рыхтуецца да паступленння ў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін.

У 1984 годзе юнак паступіў на міжнародна-прававы факультэт МДІМА. Пасля заканчэння інстытута ў 1989 годзе Іван Губар працуе ў трэцім аддзеле Міністэрства замежных спраў СССР. З 1989 па 1992 год з'яўляецца супрацоўнікам цэнтральнага апарата Пасольства СССР у ФРГ. З 1993 года па 1996 год працуе ў адной з нямецкіх кампаній.

Пасля пераезду ў Маскву займае пасаду дырэктара Маскоўскага прадстаўніцтва нямецкай фірмы, з'яўляецца генеральным прадстаўнікам расійска-германскай кампаніі.

Сёння Іван Іванавіч жыве і працуе ў Маскве. Бізнесмен, мецэнат.

У 2003 годзе ў час прастольнага свята Лелікаўскай царквы ўраджэнцы вёскі Іван Губар, браты Уладзімір і Міхаіл Шапецюкі (Мінск) ахвяравалі для царквы пяць званоў агульнай вагой 130 кг, зробленыя сучаснымі мінскімі майстрамі.

**ЛЕВАНЮК Міхаіл Феадосьевіч**. Нарадзіўся 6 сакавіка 1937 года ў вёсцы



Лелікава Кобрынскага павета (цяпер Лелікава Кобрынскага раёна) у сялянскай сям'і. Закончыў сямігодку, экстэрнам - 9 класаў у Дзівіне.

Паступіў на вучобу ў Брэсцкае чыгуначае вучылішча № 7. Пасля вучобы быў накіраваны на працу ў горад Жыгулёўск Самарскай вобласці. Працаваў на будаўнічых аб'ектах горада, у 1958 годзе - па камсамольскай пуцёўцы ў Казахстане.

Вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Кустанайскага педінстытута, а таксама на эканамічным Кустанайскага сельгасінстытута.

Працаваў у Кустанайской вобласці настаўнікам фізікі, потым дырэктарам школы.

У 1988 годзе - пераезд у Беларусь. З 1988 года па 1997 год Міхаіл Феадосьевіч быў дырэктарам Верхалескай сярэдняй школы.

У 1974 годзе ўзнагароджаны знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1973 года», у 1976 годзе - ордэнам «Знак Пашаны», у 1981 годзе - медалём «За працоўную адзнаку».

**ПАНАСЮК Іван Паўлавіч** - грамадскі дзеяч, прадпрымальнік, мецэнат, кандыдат філасофскіх навук.



Нарадзіўся 14 красавіка 1960 года ў вёсцы Лелікава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і каваля і даяркі. Пасля васьмі класаў паступіў у Мінскае сувораўскае вучылішча, выбраўшы ваенную прафесію. Вучылішча закончыў амаль на выдатна, з адной чацвёркай у атэстаце. Здольны малады чалавек змог бы паступіць у любую вышэйшую навучальную ўстанову Савецкага Саюза, але яго вабілі сібірскія абшары, нязведаная зямля, і ён выбраў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, якое ў 1981 годзе закончыў з адзнакай.

Служыў Іван Панасюк у Забайкаллі. Праз пяць гадоў з павышэннем перавялі служыць на новае месца – у г. Кызыл Тувінскай АССР. Службу праходзіў на пасадах намесніка камандзіра роты, намесніка камандзіра батальёна па палітычнай частцы, сакратара партыйнага камітэта палка (Манголія, Хакасія, Тува). Пасля заканчэння ў 1993 годзе Ваенна-палітычнай акадэміі быў накіраваны ў Сібірскую ваенную акругу, дзе служыў намеснікам камандзіра палка па выхаваўчай рабоце.

У 1993 годзе І. П. Панасюк пасля адстаўкі ў званні падпалкоўніка вырашыў заняцца прадпрымальніцтвам. Чалавек актыўны, працавіты, ён змог і ў бізнесе знайсці сябе, дабіцца поспеху. Час паказаў, што яму і гэта справа падуладна. Хутка ўзначаліў савет дырэктараў вядомай у Сібіры групы кампаній «Еўропа-Азія». Створаныя Іванам Панасюком прадпрыемствы эфектыўна працуюць у розных галінах эканомікі, перавага – вытворчай сферы, сацыяльнай накіраванасці бізнесу. Эфектыўны прадпрымальнік, удзельнік Праграмы Расійскага лідарства ў 2001 годзе быў запрошаны для ўдзелу ў Расійскай праграме лідарства Бібліятэкі Кангрэса ЗША «Открытый мир», паспяхова прайшоў навучанне па тэме «Федэралізм і рэгіянальная палітыка (ЗША, штат Луізіяна, Новы Арлеан)».

І. П. Панасюк – паліттэхнолаг, спецыяліст па выбарчых сістэмах. Паспяхова правёў некалькі выбарчых кампаній. Быў назіральнікам ад СНД на прэзідэнцкіх выбарах Рэспублікі Беларусь. Закончыў аспірантуру Сібірскай акадэміі дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі. Абараніў дысертацыю «Избирательная система как фактор трансформации современного российского общества (социально-философский анализ)» (2004), атрымаў навуковую ступень кандыдата філасофскіх навук. Кандыдацкая дысертацыя была першай працай на яго навуковым шляху, потым ён падрыхтаваў да выдання сваю другую працу – манаграфію на тэму «каляровых рэвалюцый» на постсавецкай прасторы.

Іван Паўлавіч ніколі не забываў пра Беларусь, пра сваю малую радзіму. Настальгія па Беларусі, па родным Лелікаве актыўна праявілася ў імкненні аб'яднацца з іншымі беларусамі, якія жывуць у Новасібірску; як аказалася, іх нямала — каля 30 тысяч. З групай аднадумцаў узяўся за стварэнне ў Новасібірску беларускага культурна-асветніцкага цэнтра імя беларускай святой Еўфрасінні Полацкай, з дапамогай якога можна было б хоць неяк зменшыць настальгію па родных мясцінах. У цэнтры збіраюцца выхадцы з Беларусі, якім патрэбны зносіны з землякамі, каб мець магчымасць пачуць родную мову, каб пачуць беларускія песні. Работа тут вядзецца вялікая.

І. П. Панасюк добра вядомы ў Расіі і за яе межамі мецэнат. У 2002 годзе пры яго актыўным фінансавым удзеле ў Новасібірску быў узведзены храм у гонар беларускай святой Еўфрасінні Полацкай, які стаў цэнтрам царкоўнага жыцця праваслаўных беларусаў Сібіры. Дарэчы, на эмблеме БКАЦ таксама прысутнічаюць буслы: яны быццам узлятаюць у неба на фоне трох праваслаўных купалоў. Сімвал Лелікава, сімвал Радзімы. З часу заснавання цэнтра І. П. Панасюк – старшыня праўлення Новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі «Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у імя святой Еўфрасінні Полацкай». Па даручэнні Мітрапаліта Філарэта асвячэнне храма правёў епіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан. У Новасібірску таксама не без удзелу нашага земляка працуе «беларускі канал» на гарадскім тэлебачанні, выходзіць газета «Мая Радзіма».

Як і многія дзелавыя людзі, Іван Паўлавіч жыве на некалькі краін. Значную частку часу праводзіць, напрыклад, у Іспаніі, дзе мае інтарэсы бізнесу. І, вядома, шмат часу праводзіць у роднай вёсцы. У свой летні адпачынак Іван Панасюк з сям’ёй абавязкова едзе на малую радзіму, дзе ён узвёў сельскую сядзібу з гасцявым домам. Шматгадовая дапамога роднай школе, вясковай бібліятэцы, сельскаму Дому культуры, дзіцячым дамам, школам-інтэрнатам, удзел у рэстаўрацыі мясцовай царквы і іншае рабілася і робіцца ім для землякоў.

Шмат чаго зроблена і па добраўпарадкаванні Лелікава. Асабліва значна набыццё для роднай вёскі з дапамогай сібірскага земляка спартыўнага комплексу для вялікага тэніса, які адпавядае міжнародным стандартам. Іван Паўлавіч заўсёды ў курсе ўсіх важных навін з малой радзімы. У прыватнасці, бізнесмен аказаў дзейсную дапамогу пры добраўпарадкаванні старадаўніх мясцовых могілак.

За вялікую асветніцкую дзейнасць, прапаганду духоўнай спадчыны беларускага народа ў Расійскай Федэрацыі Іван Паўлавіч Панасюк першым з грамадзян Расіі быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, які яму ўручыў у лістападзе 2004 года ў Мінску Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Іван Паўлавіч – дэлегат III Усебеларускага народнага сходу (2006), выступаў на ім па даручэнні беларусаў замежжа.

***Іван Панасюк***: «*Што дае мне сілы рухацца наперад, пераадольваць жыццёвыя віры, змагацца са складанымі задачамі, якія падкідвае лёс? Што вывела мяне ў вялікі свет, сфарміравала як асобу? Безумоўна, гэта мая Бацькаўшчына - Кобрыншчына, а калі больш дакладней - вёска Лелікава - самае чыстае, светлае, святое месца на зямлі, месца, якое на стагоддзі захавае ў сваей памяці сляды бацькоў і мае першыя няўпэўненыя крокі. Тут лёгкі подых ветру і дакрананне босай нагой да халоднай ранішняй расы ўваскрашае дзіцячыя ўспаміны, тут старая, схіленая над раўчуком бяроза хавае юнацкія таямніцы, ад згадвання пра якія і зараз трымціць сэрца, тут я не заўважаю гадоў, што пранёс за сваімі плячамі, - здаецца, быццам усё жыццё з яго вялікімі марамі і ідэямі толькі наперадзе, тут знаходзіць прытулак для адпачынку змораная душа, наталяючыся сустрэчамі з роднымі краявідамі і магчымасцю пабыць сам-насам са сваімі думкамі.*

*… Як для бусла, што кожнай вясной вяртаецца з цёплай, здаецца, такой утульнай і прывабнай для жыцця, але ўсё ж такі чужой для яго мясціны, неабходна родная буслянка, каб вывесці там птушанят і зноў сабрацца ў далёкі і цяжкі шлях, так і для мяне: апынуцца на Кобрыншчыне - гэта што расправіць крылы, запасціся такой жыццёвай энергіяй, якую больш нідзе не атрымаеш*».



**СТАРЫКАВА Анастасія Зоцікаўна**. Нарадзілася ў 1934 годзе ў вёсцы Лелікава Кобрынскага павета (цяпер Лелікава Кобрынскага раёна). З 1949 года працавала ў калгасах «Чырвоная зорка» Кобрынскага раёна, імя Лесі Украінкі Валынскай вобласці (Украіна), саўгасах «Нежынскі» Какчатаўскай вобласці (Казахстан), «Патрыкі» Кобрынскага раёна.

За высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве працаўнікоў сельскай гаспадаркі ў 1970 годзе ўзнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100 годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». У красавіку 1971 года адзначана вышэйшай узнагародай Радзімы - ордэнам Леніна.



**ТРУБЧЫК Анатолій Паўлавіч**. Нарадзіўся 28 студзеня 1959 года ў вёсцы Лелікава Кобрынскага раёна. Вучыўся ў Дзівінскай сярэдняй школе-інтэрнаце, якую закончыў у 1976 годзе. У 1977 годзе з адзнакай закончыў Брэсцкае тэхнічнае вучылішча № 1.

Службу ў арміі праходзіў у Нарыльску, у 1979 годзе звольнены ў запас у званні сяржанта.

У 1980 годзе паступіў на службу ва УУС Брэсцкай вобласці міліцыянерам спецкамендатуры. У 1983 годзе з адзнакай закончыў поўны курс Мінскай вышэйшай школы (МВШ) МУС СССР (цяпер Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь) з прысваеннем кваліфікацыі юрыста.

У 1983 годзе для далейшага праходжання службы накіраваны ў г. Хабараўск. У 1984 годзе паступіў у Хабараўскую вышэйшую школу МУС СССР. У 1995 годзе закончыў Акадэмію МУС Расіі з прысуджэннем кваліфікацыі «Арганізатар праваахоўнай дзейнасці». З 2000 года па 2003 год - намеснік начальніка УУС Хабараўскага краю – начальнік штаба.

З 2003 года па сённяшні час Анатолій Паўлавіч працуе дырэктарам па агульных пытаннях акцыянернага таварыства «Хабараўскі завод прамысловага і грамадзянскага домабудавання».

Узнагароджаны ордэнам Мужнасці (1996), медалямі «За безупречную службу» 3-й, 2-й ступеняў, «За отвагу», нагруднымі знакамі «Почётный сотрудник МВД», «Ветеран боевых действий» і інш.



**ШАПЯЦЮК Уладзімір Васільевіч**. Нарадзіўся 26 жніўня 1958 года ў вёсцы Лелікава Кобрынскага раёна. Бацькі працавалі ў калгасе «Чырвоная зорка». У сям'і было пяцёра дзяцей: дзве сястры і тры браты. Дзяцінства Уладзіміра прайшло ў роднай вёсцы. З дзіцячых гадоў ён бачыў, як жывуць і працуюць людзі, ведаў цану хлебу. Сам дапамагаў бацькам, ніколі не адказваўся ад працы па гаспадарцы. У вольны час займаўся любімай справай: з запалак, паперы і іншых матэрыялаў будаваў самалёты, гуляў у вайну з сябрамі.

У 1975 годзе Уладзімір закончыў Лелікаўскую сярэднюю школу. Яго не пакідала дзіцячая мара падняцца высока ў неба,

быць лётчыкам.

Нягледзячы на сямейныя цяжкасці, юнак вырашае працягваць вучобу. У 1976 годзе ён вучыцца ў Саратаўскім авіяцыйным вучэбным цэнтры, у 1978-м стаў курсантам Вязнікаўскага авіяцыйнага цэнтра ДТСААФ.

У 1979 годзе закончыў Саратаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў, атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю (пілот-тэхнік). Пасля заканчэння вучылішча яго накіроўваюць на службу ў Грузію (горад Цхінвалі), потым на трохмесячныя курсы ў горад Ліпецк.

З мая 1980 года - у Афганістане. Уладзімір Шапяцюк здзейсніў 115 баявых вылетаў. 18 кастрычніка 1980 года ў час баявога вылету ў складзе экіпажа верталёта падчас атакі лейтэнант Шапяцюк загінуў.

Пасмяротна Уладзімір Васільевіч Шапяцюк узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (4 чэрвеня 1981 года), медалём у памяць 10-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа» (15 мая 1988 года).




З 2004 года Лелікаўская сярэдняя школа носіць імя Уладзіміра Шапецюка. У 2006 годзе на школе, у якой ён вучыўся, устаноўлена мемарыяльная дошка. У школьным музеі ў пакоі Славы, за шклом, знаходзіцца ваенная вопратка - шынель, вайсковы плашч, парадны кіцель Уладзіміра Шапецюка, а таксама значная частка дакументальных матэрыялаў, якія падаравала школе маці героя Марыя Нікандраўна.

Пахаваны Уладзімір Шапяцюк на могілках у вёсцы Лелікава. На магіле героя побач з мармуровым помнікам узвышаецца лопасць шрубакрылай машыны, якая сімвалізуе апошні палёт малодшага лейтэнанта Уладзіміра Шапецюка. На лопасці – ахоўны знак «Рэспубліка Беларусь. Воінскае пахаванне. Прычыненне шкоды караецца законам».

На дарогах раёна і вуліцах горада можна ўбачыць аўтобус, на якім вялікімі літарамі напісана «Уладзімір Шапяцюк», а вышэй меньшымі, што гэты аўтобус названы ў гонар нашага земляка – ваеннага лётчыка, які загінуў восенню 1980 года ў небе Афганістана, і зроблены з металічнага лому, сабранага піянерамі Кобрыншчыны.

## *Мясцовыя краязнаўцы*



**ТРУБЧЫК Мікалай Пракоф'евіч**. Паважаны ў вёсцы чалавек, мясцовы краязнаўца. У Лелікаве яго ведаюць як чалавека адукаванага і дасведчанага. Вясковы бібліятэкар, які шмат пра што можа расказаць.

Нарадзіўся Мікалай у 1939 годзе. Яго дзяцінства абпаліла вайна. І сёння ён выразна памятае бамбёжкі, ад якіх дрыжала хата. Памятае, з якой нецярплівасцю чакаў бацьку, калі вайна скончылася… З сямі гадоў хлопчык пасвіў кароў, дапамагаў бацькам. У 1947 годзе пайшоў у мясцовую сямігодку, вучыўся старанна. Планаваў атрымаць сярэднюю адукацыю.

Калі Мікалаю споўнілася чатырнаццаць, памерла маці. Планы наконт далейшай вучобы прыйшлося адкласці. Праз нейкі час бацька ажаніўся, сям'я пабольшала, і Мікалай да арміі пераважна жыў у бабулі.

Уладкаваўся на працу ў мясцовы калгас «Чырвоная зорка» паляводам. Тагачасны старшыня калгаса Міхаіл Пшанай адразу заўважыў руплівага здатнага хлопца і перавёў яго ў кантору спецыялістам па налічэнні працадзён.



Потым – армія, служба ў пагранічных войсках. У 1960 годзе за ўзорнае нясенне службы па ахове дзяржаўнай мяжы Саюза ССР Мікалай Трубчык узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатны пагранічнік».

Пасля звальнення ў запас Мікалай у пошуках заробку тры гады запар ездзіў на сезон у Саратаўскую і Растоўскую вобласці.

Вывучэннем роднага краю Мікалай Пракоф'евіч займаўся ўсё жыццё. Бездакорна ведае назвы мясцовых урочышчаў, іх гісторыю.



Мікалай ТРУБЧЫК,
(вёска Лелікава, Кобрынскі раён)

ЧАГО ЛЕЗЦІ, ДЗЕ КОНЕЙ КУЮЦЬ

СЛОЎКА-САЛОЎКА

Мікалай ТРУБЧЫК
(вёска Лелікава, Кобрынскі раён).

ПРА ЎПАРТЫХ...

Мікалай ТРУБЧЫК
(вёска Лелікава, Кобрынскі раён)

ПАЗНАЮЦЬ І Ў СЯРМЯЗЕ

— Ны бара Бога за бороду.

— Налоза й на пань (пень), то буда подобань (прыгожы).

СЛОЎКА-САЛОЎКА

МІКАЛАЙ ТРУБЧЫК
(вёска Лелікава, Кобрынскі раён)

«ВЫПАДАК» НА ЛЮБЫ ВЫПАДАК

ВЯЛІКІ ВЫПАДАК.

З ДОМУ

«НАВАРЭЛА ЛУЦЯ (ЛУКЕР'Я), ШЧО НЫ ПАРАХЛАБЧА Й ЦЮЦЯ (САБАКА)».

СЛОЎКА-САЛОЎКА

З ВЯЛІКАГА ПЕРАБОРУ...

— З вялэкого парабору ўзеў Хвадору.

ЯК У ЕГІПЦЕ

— Пратоўкласе, як у Ягэпта (Егіпце)

Калі стаў працаваць у сельскай бібліятэцы, пачаў займацца афармленнем краязнаўчых матэрыялаў, якія да закрыцця бібліятэкі там захоўваліся. Многія з іх друкаваліся на старонках рэспубліканскіх перыядычных выданняў: часопіса «Вожык», газеты «Звязда» і іншых, былі адзначаны ўзнагародамі.

Працу ў бібліятэцы, краязнаўчую работу і хатнія клопаты Мікалай Трубчык выдатна спалучаў з вучобай у Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме імя А. С. Пушкіна, які скончыў у 1973 годзе.

У 1997 годзе аднавяскоўцы выбралі Мікалая Трубчыка старастам вёскі. Шэсць гадоў ён нёс грамадскую нагрузку. За гэты час абгарадзілі мясцовую царкву, могілкі, ліквідавалі несанкцыянаваныя звалкі. Актыўна вялася і культурна-масавая работа. Пасля выхаду на пенсію, у 64 гады, Мікалай Пракоф'евіч пакінуў і грамадскую пасаду, быў царкоўным старастам.

У 1970 годзе Мікалай Пракоф'евіч Трубчык узнагароджаны медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».



**ШАПЯЦЮК Пётр Сцяпанавіч**. Мясцовы краязнаўца, паэт, носьбіт традыцыйнай культуры.

Нарадзіўшыся ў 1945 годзе ў вёсцы Лелікава, ён пражыў там усё жыццё. Яшчэ ў дзяцінстве зацікавіўся гісторыяй сваёй вёскі, яе побытам і традыцыямі. Кожным вечарам, асабліва зімой, на вячоркі ў іх хаце збіраліся аднавяскоўцы, любілі ўспомніць мінулае. Малы Пятро пад час вячаровых гутарак сядзеў на печы ды слухаў, пакуль не засынаў.

Пётр Шапяцюк закончыў Магілёўскае культасвет-вучылішча імя Н. К. Крупскай (цяпер - Магілёўскі

дзяржаўны каледж мастацтваў). Паўжыцця працаваў загадчыкам Лелікаўскага клуба. «Міністр культуры» - так Пятра Шапецюка жартам называлі некаторыя аднавяскоўцы. Але трывала замацавалася за ім яшчэ бацькава мянушка «Чычык», якой ён нават падпісваў свае творы. Бацьку ж так назваў не хто чужы, а ўласная жонка - за тое, што пасля шабашак на Украіне стаў вымаўляць «чы» замест мясцовага «цы» (адпаведнік літаратурнаму злучніку «ці»). Будучы на Украіне, ён прывык размаўляць, як на Житоміршчыне. Напрыклад, на мясцовым дыялекце «Цы ты чув пра тэе?», Сцяпан не «цыкаў», як усе, а «чыкаў». Вось і празвалі Чычыкам.

Пётр Шапяцюк і вершы пісаў, і слоўнікі мясцовых гаворак складаў, і музейнай справай займаўся. Ён ведаў кожны закуток Лелікава і яго ваколіц, вёў летапіс сённяшніх дзён.

У час вучобы ў Магілёўскім культасветвучылішчы стаў пісаць вершы. Працуючы на працягу 37 гадоў у сельскім Доме культуры, прыходзілася складаць сцэнарыі для сваіх мерапрыемстваў і ў прозе, і ў вершах. Пісаў вершы на трох мовах: беларускай, рускай і па-лелікаўскі - на родным дыялекце. Вывучаў і ўкраінскую мову, каб і на ёй ствараць вершы. Вершы Пятра Шапецюка друкаваліся ў газетах «Аргументы и факты», «Народная трыбуна», «Кобрынскі веснік», у беларуска-ўкраінскім альманаху «Справа».

Аднойчы знакаміты зямляк Іван Панасюк папрасіў напісаць Пятра Сцяпанавіча гісторыю вёскі, працу паабяцаў выдаць за свой кошт. Пётр Шапяцюк за работу ўзяўся сур'ёзна, збіраў гісторыю па крупінках. І ў яго атрымалася. У кнізе «Скарбонка майго краю» змешчана шмат цікавых звестак, запісаны сярод іншага і мясцовыя прымаўкі, прыказкі, якія даюць яркае ўяўленне пра мясцовы дыялект.

Неяк патэлефанаваў Пятру Сцяпанавічу знаёмы філолаг з Мінска. Прафесара зацікавіла лелікаўская гаворка, ён і прапанаваў скласці слоўнік слоў-архаізмаў, а таксама тых слоў, што ўжо выходзяць з ужытку вяскоўцаў. Таксама прасіў апісаць мясцовы абрад вяселля. Хоць і было складана, але і з гэтай задачай Пётр Шапяцюк справіўся. Дапамагала яму першая памочніца, надзейны таварыш па жыцці - жонка Анастасія Ігнац'еўна, захавальніца старажытнай традыцыі - касцюма свахі.



Пётр Сцяпанавіч стараўся перадаць смак гаворкі сваім унукам. «Нават крыўдна, што нашу мову забываюць, - дзяліўся ён думкамі. - Ужо мае ўнукі не ведаюць лелікаўскай гаворкі. Яны яе разумеюць, але гавораць усё больш па-руску».

Пасля выхаду на пенсію Пётр Сцяпанавіч займаў грамадскую пасаду старасты вёскі і да сваіх абавязкаў адносіўся сур'ёзна.

Фільм пра яго з жонкай Анастасіяй дзейнасць па захаванні мясцовай культурнай спадчыны выйшаў на тэлеканале «Беларусь 3» 13 студзеня 2021 года.

12 лютага 2021 года Пётр Сцяпанавіч памёр.

# СПІС КРЫНІЦ

**Андреевец, Г.** В краю белых птиц / Григорий Андреевец // Две родины : в 2-х ч. / Григорий Андреевец. - Москва, 2009. - Ч. 2. - С. 455-472.

Жизненный путь И. П. Панасюка, уроженца д. Леликово Кобринского района.

**Ардэнаносцы. Старыкава** Анастасія Зоцікаўна // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 428. - (Вызначыліся працай).

**Бондаренко, В. В.** Четыре судьбы. Одна родина : роман / Вячеслав Бондаренко. – Мінск : Аверсэв, 2018. – 806 с. : ил.

Есть упоминание о д. Леликово Кобринского района.

**Гісторыя** Беларускай ССР : у 5 т. - Мінск, 1972. – Т. 1. – 631 с.

Гл. на с. 54.

**В. Лелікава**, Дзівінскі сельсавет: Дзмітрыеўская царква. Помнік землякам // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. - С. 234.

**Д. Леликово**, Дивинский сельсовет: Дмитриевская церковь. Памятник землякам // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. - Минск, 1990. – С. 258.

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. Анастасия Зотиковна Старикова // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Князева, В. М.** Лелікава / В. М. Князева // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 589. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Лелікава** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 9. – С. 195.

**Лелікава** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 299.

**Лелікава** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. - Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 158-159.

**Леликовская** Дмитриевская церковь // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. – Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 16.

**Лелікаўская** Дзмітрыеўская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [в 6 т.]. – Т. 5. - С. 47-48 : фат.

**Кунц, Н. З.** Панасюк Иван Павлович / Н. З. Кунц // Гордость кадетского братства: выпускники суворовских военных и нахимовских военно-морских училищ, добившихся государственной и общественной известности / Н. З. Кунц. - М., 2010. - С. 438-440 : фат.

**Мароз, В. В**. XVIII стагоддзе. Лелікава / В. В. Мароз // Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск, 2018. - С. 202- 204.

**Помнікі** архітэктуры. Вёска Лелікава, Дзівінскі сельсавет: Дзмітрыеўская царква XVIII ст. // Гісторыка-культурная спадчына Кобрыншчыны. - Баранавічы, 2001. - С. 11.

**Свята-Дзмітрыеўская** царква ў в. Лелікава // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 464-465 : фат. – (Архітэктурная спадчына Кобрыншчыны).

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 447-448 : фота. – (Загінулі ў Афганістане).

**Шапяцюк, П. С.** Скарбонка майго краю в. Лелікава / П. С. Шапяцюк. - Лелікава, 2005. - 45 с.

**Шапяцюк, П**. [Успаміны] / Пятро Шапяцюк // Справа : беларуска-ўкраінскі альманах Таварыства ўкраінскай літаратуры пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў. - Мінск, 2016. - Вып. 3. - С. 196-202.

**Шэпетюк, П.** Е скажу свое слово на свойій, ріднуй мовэ... : [верш] / Пэтро Шэпетюк // Справа : альманах. - Мінск, 2015. - Вып. 2. - С. 82.

**Шэпетюк, П.** [Стихи] / Пэтро Шэпетюк // Справа : беларуска-ўкраінскі альманах Таварыства ўкраінскай літаратуры пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў. - Мінск, 2015. - Вып. 1. - С. 144-149.

Стихи и биография П. Шепетюка (на укр. яз.), есть фото.

**Бакун, Е.** Почтальон — звучит гордо / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 5 мая (№ 35). — С. 5 : фот.

О работе отделения почтовой связи в д. Леликово Кобринского района.

**Кирилюк, Л.** В центре внимания — сваха! / Лилия Кирилюк // Кобрин-информ. - 2021. — 10 июня (№ 23). — С. 24 : фот.

Костюм свахи из деревень Леликово и Повитье выставлен в кобринском музее в июне**.**

**Кірылюк, Л.** У цэнтры ўвагі — сваха! / Лілія Кірылюк ; фота з архіва ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава // Кобрынскі веснік. - 2021. — 12 чэрвеня (№ 46). — С. 9.

**Пашковіч, Л. В.** Прамяні ізумруднага вяселля / матэрыялы старонкі падрыхавала Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2021. — 6 сакавіка (№ 19—20). — С. 5 : фат.

Пра сям'ю Васіля Ульянавіча і Ганны Нікандраўны Жук з в. Лелікава, якія адзначаюць 55 гадоў сумеснага жыцця.

**Строцкая, Г.** Сваха приглашает! / Галина Строцкая // Беларускі час. - 2021. — 28 мая — 3 июня (№ 21). — С. 18 : фот.

**Бакун, Е.** Прерванный полет, или Между небом и землей / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 лютага (№ 12). — С. 4, 9 : фот.

Воин-интернационалист В. Шепетюк из д. Леликово достойно исполнил свой долг перед Родиной.

**Вовк, Ю**. О костюме свахи, или Нематериальное культурное наследие Кобринщины / Юлия Вовк ; фото Юрия Киндина // Кобрин-информ. - 2020. — 7 мая (№ 19). — С. 4 : фот.

**Казакова, А.** Сохраним ли шедевр народного зодчества? / Анна Казакова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 11 красавіка (№ 28). — С. 3.

О том, как решается судьба сгоревшего храма в д. Леликово Кобринского района.

**Кірылюк, Л**. Без яе якое вяселле? / Лілія Кірылюк // Культура. - 2020. — 1 жніўня (№ 31). — С. 13 : фат.

Супрацоўнікі Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава заняліся даследваннем асаблівасцяў касцюма свацці.

**Козлович, В**. Сваха в перьях / Валентина Козлович ; фото Александра Кулевского // Советская Белоруссия. - 2020. — 19 февраля (№ 33). — С. 8 : фот.

О костюме леликовской свахи Кобринского района.

**Лабачэўская, В**. Строй свахі і свашак на Палессі як з'ява культуры беларуска-ўкраінскага памежжа / Вольга Лабачэўская // Роднае слова. - 2020. — № 9. — С. 82-85.

**Лосич, П.** Говорит и показывает Леликово / Павел Лосич // Рэспубліка. - 2020. — 18 студзеня (№ 9). — С. 9 : фот.

О деревне Леликово Кобринского района.

**Бровач, О.** В Кобринском районе сгорела церковь XVIII века / Оксана Бровач // Комсомольская правда. - 2019. — 12 февраля. — С. 3.

Православная церковь в д. Леликово — архитектурный памятник республиканского значения.

**Весялуха, М.** Абскубаць сем пеўняў на галаўны ўбор / Марына Весялуха // Літаратура і мастацтва. - 2019. — 26 ліпеня. — С. 16 : фот.

Як рыхтаваліся да вяселля знакамітыя свахі з в. Лелікава.

**Вечорко, С.** Нужно дома бывать не гостем / Светлана Вечорко // 7 дней. - 2019. - 15 августа. - С. 17.

Бизнесмен-меценат Иван Панасюк благоустраивает родную деревню Леликово в Кобринском районе.

**Пожар** // Духовный вестник. - 2019. — № 4 (апрель). — С. 7.

Произошло возгарание Свято-Дмитриевской церкви XVIII века в д. Леликово Кобринского района.

**Трубчик, Н.** «Маршал Толбухин спросил: «Почему, солдат, хромаешь?» - и подвез к месту назначения» / Николай Трубчик // Комсомольская правда. - 2019. — 22-28 мая. — С. 11.

Житель д. Леликово П. Трубчик в годы Великой Отечественной войны воевал на 3 Украинском фронте, которым командовал маршал Ф. И. Толобухин.

**Яскевіч, С**. Сын малой радзімы / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2019. - 7 верасня. - С. 11.

Расійскі бізнесмен і мецэнат І. Панасюк дапамагае добраўпарадкоўваваць родную вёску.

**Бакун, Е.** Их первые шаги в науку / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 27 студзеня. — С. 1, 4.

Успешно проходят занятия научно-исследовательской деятельностью в Леликовской средней школе.

**Бакун, А.** Сонечнай душы чалавек / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2018. — 31 студзеня. — С. 4.

Фельчар ФАПа в. Лелікава М. Г. Васюк кожны дзень імкнецца апраўдаць давер сваіх пацыентаў.

**Дубіна, Л.** У шчасці і ў горы разам / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2018. — 15 снежня. — С. 9.

Сям'я Паўла і Паліны Дземчык з в. Лелікава адзначыла залатое вяселле.

**Знакомимся** с Ящуром, женимся со свахами // 7 дней. - 2018. - 10 мая. - С. 28,29.

Использование убора леликовской свахи войдет в Государственный список историко-культурных ценностей.

**Козлович, В.** Что у свахи на голове / Валентина Козлович // СБ. Беларусь сегодня. – 2018. – 19 мая. – С. 7.

Недавно костюм леликовской свахи как нематериальное наследие внесен в Государственный список историко-культурных ценностей Беларуси.

**Марчук, Н.** История села Леликово Кобринского района / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2018. — 4 января. — С. 6-7.

**Мы** з Кобрыншчыны. Іван Панасюк // Кобрынскі веснік. - 2018. - 14 ліпеня. - С. 2.

І. Панасюк - кандыдат філасофскіх навук, ураджэнец в. Лелікава – аб сваёй малой радзіме.

**Сацута, А**. Народнае дэфіле / Алёна Сацута // Заря. - 2018. — 24 февраля. — С. 9.

Народны касцюм лелікаўскай свахі прадстаўляе багатую палітру абрадавага строю.

**Сергеев, И.** Наряд для свахи / Иван Сергеев // Заря. – 2018. – 5 мая.

Традиции изготовления и использования убора леликовской свахи получат статус историко-культурной ценности.

**Сматрэнка, А.** Спіс пашыраецца / Аксана Сматрэнка // Рэспубліка. - 2018. — 13 снежня. — С. 9.

Сярод нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у Дзяржаўным спісе прадстаўлены ўбор лелікаўскай свацці Кобрынскага раёна.

**Бакун, А.** З любоўю да зямлі роднай / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 11 студзеня. — С. 8.

Пётр і Анастасія Шапецюкі — вядомая сямейная пара з в. Лелікава.

**Бакун, Е.** Философ с душой романтика / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 25 студзеня. — С. 8.

Умелые руки у учителя трудового обучения Леликовской школы А. Панасюка.

**Бялоў, Д.** І жыве спрадвечная сувязь / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 27 мая. — С. 4.

Заняткі краязнаўчага абяднання «Спадчына» Лелікаўскай сярэдняй школы прысвечаны гісторыі Кобрыншчыны, в. Лелікава, матэрыяльнай і духоўнай культуры продкаў.

**Бялоў, Д**. Ушанавалі памяць герояў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 18 лютага. — С. 2.

У вёсцы Лелікава шануюць памяць аб загінуўшым воіне-інтэрнацыяналісце У. Шапяцюку.

**Жук, Е.** Сваха как ценность государства / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. — 17 марта. — С. 6.

Костюм леликовской свахи претендует на статус памятника материального и духовного наследия нации.

**Курбат, Л.** Ах, якая сваха! / Лідзія Курбат // Заря. – 2017. – 16 марта.

**Ускова, Т.** Лелікаўская свацця бачыць ўсё / Таццяна Ускова // Сельская газета. - 2017. — 14 марта. — С. 11.

Гарнітур лелікаўскай свацці прэтэндуе на ўключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей краіны.

**Дубіна, Л**. Толькі б ты, наша вёска, жыла! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 12 кастрычніка. — С. 5.

У в. Лелікава адзначылі юбілейную дату - 470 гадоў з першага згадвання пра вёску ў летапісных крыніцах.

**Курец, А.** Меценат хотел как лучше, а сельчане сделали как всегда / Александр Курец // Сельская газета. - 2016. — 15 декабря. — С. 4.

Слабая загруженность спортивных объектов - эта проблема возникла в д. Леликово Кобринского района.

**Бялоў, Д**. І першай настаўніцы добрае слова / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2015. — 5 верасня. — С. 1.

У Лелікаўскай СШ прайшла ўрачыстая лінейка, прысвечаная новаму навучальнаму году.

**Вазнюк, Ю**. Встреча с пограничниками / Юлия Вазнюк // Кобрин-информ. - 2015. — 29 октября. — С. 4.

В ГУО «Леликовская средняя школа им. В. Шепетюка» прошла профориентационная встреча военнослужащих погранзаставы «Дивин» со старшеклассниками.

**Дубіна, Л.** Жыццё, напоўненае сэнсам / Людміла Дубіна ; фота аўтара і з архіва М. Трубчыка // Кобрынскі веснік. - 2015. — 21 студзеня. — С. 8.

Пра М. П. Трубчыка, ветэрана працы, цяпер - царкоўнага старасту в. Лелікава, які з жонкай Марыяй адзначылі залатое вяселле.

**Дубина, Л.** З гарадскім шармам / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2015. - 26 жніўня. – С. 4.

Пра работу Лелікаўскага фельчарска-акушэрскага пункта.

**Дубіна, Л.** Усё тут робіцца з душой / Людміла Дубіна/ / Кобрынскі веснік. – 2015. – 3 студзеня. – С. 2.

Па новым адрасе адчыніў дзверы для сваіх пацыентаў фельчарска-акушэрскі пункт у Лелікаве.

**Шэпэтюк, П**. Абрад вяселля ў вёсцы Леліково / Анастасія Шэпэтюк // Бельскі гостінэць : краязнаўча-культурны зборнік. - 2015. — № 1. — С. 142-151,152.

**Дубина, Л**. Благодать родного храма / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. – 2014. – 19 лістапада. – С. 3.

Вместе с храмовым торжеством жители Леликово отмечали 25-летие со дня повторного освящения Свято-Дмитриевской церкви.

**Хоміч, І.** Аўсвайс-кантроль і аўтэнтычнасць : жыццё ў памежнай зоне / Іна Хоміч // Брестский курьер. – 2014. – май (№ 21). – С. 9.

Вёска Лелікава: асаблівасці жыцця.

**Гармель, Е.** Молодые и лучшие / Елена Гармель // Заря. - 2013. - 30 апреля. - С. 6.

Учитель начальных классов Леликовской школы Т. Максимович вышла в финал областного конкурса профмастерства среди педагогов.

**Грышкевіч, С.** Настаўнік у чацвёртым пакаленні / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. – 2013. – 21 мая. – С. 3.

У фінал І абласнога конкурсу «Малады настаўнік Брэстчыны» выйшла настаўніца пачатковых класаў Лелікаўскай СШ Т. В. Максімовіч.

**Занько, Н.** Рана на сэрцы не загойваецца / Настасся Занько // Кобрынскі веснік. - 2013. — 20 лютага. — С. 2.

Вечар памяці загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў прайшоў у Лелікаўскай школе.

**Лесік, І.** Прыхільнік традыцыйнай культуры / Ірына Лесік ; фота з архіва П. С. Шапецюка // Кобрынскі веснік. - 2013. — 23 кастрычніка. — С. 3.

П. С. Шапяцюк зацікавіўся гісторыяй роднай вёскі Лелікава яшчэ ў дзяцінстве.

**Максимович, Т.** Шаг на пути к мастерству / Татьяна Максимович ; [беседовала] Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013. — 7 февраля. — С. 2.

Интервью с победителем районного этапа конкурса молодых педагогов, учителем начальных классов Леликовской СШ.

**Савчук, М.** Самая точная и оперативная / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013. — 16 мая. — С. 4.

Участница областного конкурса профессионального мастерства «Молодой учитель Брестчины-2013» Т. Максимович из Леликовской СШ стала победителем в номинации «Мысли точно и оперативно».

**Шэпэтюк, П.** Слоўнік мовы вёскі Лелікова / Пэтро Шэпэтюк // Бельскі гостінэць : краязнаўча-культурны зборнік. - 2013. — № 1. — С. 95-102, 103.

П. Шапяцюк склаў слоўнік гаворак в. Лелікава.

**Ганчук, А.** «Адной рукой гайдай калыску сына.. » / А. Ганчук // Народная трыбуна. - 2012. - 5 кастрычніка. - С. 11.

**Федаровіч, І.** Ці зарасце зямля спрэс лазой? / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2012. - 28 лістапада. - С. 3 ; Вечерний Брест. - 2012. - 30 ноября. - С. 1; Заря. - 2012. - 1 декабря. - С. 2 ; Народная трыбуна. - 2012. - 7 снежня. - С. 3.

У в. Лелікава беларуска-чэшская фірма пачне вырошчваць у прамысловых масштабах лазу.

**Шапяцюк, П.** Журба / Пятро Шапяцюк // Народная трыбуна. - 2012. - 31 жніўня. – С. 12.

**Шэпэтюк, П.** Моім нашчадкам : верш ; Е про свое : паэма / Пэтро Шэпэтюк // Бельскі гостінэць : краязнаўча-культурны зборнік. - 2012. — № 1. — С. 133-144

**Трубчик, Н.** Роковая травма / Н. П. Трубчик // Аргументы и факты в Беларуси. - 2011. - № 1. - С. 33.

О четырёх поколениях семьи Трубчик из Леликово.

**Ярмалюк, Л**. Вучылі і вучаць / Людміла Ярмалюк // Кобрынскі веснік. - 2010. - 10 сакавіка. - С. 3.

Сустрэча выпускнікоў у Лелікаўскай СШ.

**Андреевец, Г.** В краю белых птиц : очерк / Григорий Андреевец // Неман. - 2009. - № 2. – С. 130-138.

У истоков всех больших начинаний по зарождению белорусскости в Сибири стоит наш земляк И. П. Панасюк.

**Белов, Д.** Оазис в глубинке / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 14 чэрвеня. - С. 2.

О теннисном корте и других достопримечательностях д. Леликово.

**Гордей, Е.** Над селом – лелеки / Е. Гордей // Белорусская нива. - 2007. - 10 ноября. - С. 14.

Краевед П. Шепетюк - о деревне Леликово.

**Ляшкевіч, І.** Лелікава будзе жыць / І. Ляшкевіч // Звязда. - 2007. - 31 мая.

**Пянко, А.** С любовью к малой родине : Благо творить / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 14 лістапада. - С. 1-2.

Обновление Дмитриевской церкви в д. Леликово.

**Чебоксарова, М.** Большой теннис для маленьких чемпионов / Мария Чебоксарова // Кобрынскі веснік. - 2007. - 13 чэрвеня. - С. 4.

В д. Леликово на суперсовременном корте прошёл первый детско-юношеский турнир «Буслік Палесся».

**Васильев, С.** Высокий теннис в Леликово / С. Васильев // Вечерний Брест. – 2006. – 30 августа. – С. 4.

Уроженец д. Леликово И. Панасюк выделил средства на строительство теннисного корта.

**Васюк, Н.** Иван Панасюк: «Я родом из Леликово!» / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2006. - 7 сентября. - С. 3.

В 2004 году И. П. Панасюк первым из граждан России был награжден белорусской медалью Франциска Скорины.

**Вясковае** свята з расійскім акцэнтам // Народная трыбуна. – 2006. – 2 верасня. – С. 3.

Вёска Лелікава адзначыла 460-годдзе з часу заснавання.

**Звезды** тенниса провели мастер-класс на корте в Леликово // Заря. – 2006. – 29 августа. – С. 1.

26 августа в д. Леликово состоялось 460-летие со дня основания деревни и открытие современного теннисного корта.

**Козлович, В.** Бандеровцы в деревне Леликово / Валентина Козлович // СБ. Беларусь сегодня. – 2006. – 11 ноября. – С. 14.

**Куварина, Т**. Деревня, в которую возвращаются аисты / Татьяна Куварина // Нёман. - 2006. - № 12. - С. 157–165.

Об открытии тенисного спортивного клуба в д. Леликово.

**Куварына, Т.** Край, куды вяртаюцца буслы / Т. Куварына // Маладосць. – 2006. – № 11. – С. 106 – 111.

Свята вёскі Лелікава.

**Петровская, М.** Родной деревне посвящается / М. Петровская // Кобрынскі веснік. – 2006. – 30 жніўня.

**Праздник** в Леликово // Кобрин-информ. – 2006. – 31 августа. – С. 3.

**Пятроўская, М**. Жыве ў Сібіры беларус / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. - 2005. - 5 лютага.

Ураджэнец в. Лелікава І. П. Панасюк.

**Панасюк, И. П.** «Я никогда не стыдился того, что я родом из деревни» / [Иван Павлович Панасюк ; беседовал] Виктор Гарбыш // Мая Радзіма. - 2004. - июнь. - С. 12, 13.

**Сацук, А.** Верность полю / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2004. – 22 снежня. – С. 2.

О механизаторе СПК «Любань» В. И. Бойко из д. Леликово.

**Гурин, А.** Все мы родом из детства / Анатолий Гурин // СБ. Беларусь сегодня. – 2003. – 3 сентября. – С.1,2.

**Козлович, В.** «Песняры» чествовали Леликово / В. Козлович // Вечерний Брест. – 2003. – 29 августа. – С. 3.

460-летие со дня основания широко отмечала д. Леликово Кобринского района.

**Лежава, В.** Праздник деревни с «Песнярами» / Виктория Лежава // Кобрин-информ. – 2003. – 4 сентября. – С. 1.

**Орлова, И.** Аисты из Леликово не улетают / Ирина Орлова // Народная газета. – 2003. – 2 верасня. – С. 2.

Деревня Леликово отметила своё 460-летие.

**Панасюк, І**. Размова пра свята з чалавекам, які падарыў яго землякам / [Іван Панасюк ; гутарыў] Сымон Свістуновіч // Звязда. - 2003. - 2 верасня. - С. 3.

Спонсарам свята в. Лелікава стаў яе зямляк І. Панасюк.

**Панасюк, И.** «Я никогда не стыдился того, что родом из деревни» / Иван Панасюк; [беседовал] Виктор Гаврыш // Крыніца. - 2003. - № 10. - С. 30-33.

**Подарил** деревне праздник // Заря. – 2003. – 2 сентября. – С. 1.

Деревня Леликово отметила свое 460-летие.

**Пятроўская, М**. Урокі айца Віктара / Марыя Пятроўская // Корынскі веснік. – 2003. – 1 лютага. – С. 6.

**Свістуновіч, С.** Свята ў Лелікава / С. Свістуновіч // Звязда. – 2003. – 29 жніўня. – С. 7.

460-годдзе вёскі адзначылі жыхары в. Лелікава.

**Спасюк, А.** Як ушаноўвалі Лелікава… / Алена Спасюк // Голас Радзімы. – 2003. – 25 верасня. – С. 1.

**Хільчук, М.** З малітваю і песняю ўдвая святочны дзень / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 3 верасня. – С. 3.

У Лелікава адзначылі 460-годдзе з часу перашага ўпамінання.

**Хільчук, М**. Клічуць заны да веры, надзеі і шчасця / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 26 лістапада. – С. 2.

Царква ў в. Лелікава.

**Хільчук, М.** І вёска стала яе лёсам / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 6 сакавіка.

У в. Лелікава настаўніца Валянціна Уладзіміраўна Трубчык расла як спецыяліст і як актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця.

**Пятроўская, М**. Школе – 20 гадоў / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1991. – 28 верасня.

**Шугай, А**. Дзе селяцца буслы / А. Шугай // Камуністычная праца. – 1990. – 20 верасня.

Вёска Лелікава, старажылы вёскі, ёсць фота.

**Бойко, Н**. Леликово вчера и сегодня / Н. Бойко, В. Актысюк // Заря. – 1979. – 22 сентября.

**Балка, І.** Аўтарытэт урача / І. Балка // Камуністычная праца. – 1970. – 19 снежня.

Аб урачы К. П. Кашко, в. Лелікава.

**Цецярук, М.** Кнігу – у кожны дом / М. Цецярук / Камуністычная праца. – 1959. – 3 кастрычніка.

Аб Лелікаўскім клубе і бібліятэцы.

## *Бібліяграфічныя выданні*

**Юбілейныя** даты населеных пунктаў Кобрынскага раёна. **Лелікава** – 475 гадоў з часу першага ўпамінання (1546) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 8.

**Юбілейныя** даты вёсак Кобрынскага раёна. **Лелікава –** 470 гадоў // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2016. - С. 19-21.

**Ардэнаносцы.** Узнагароджаныя ордэнам Леніна. **Старыкава Анастасія Зоцікаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. - С. 24 : фат.

**Леванюк** Міхаіл Феадосьевіч // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. - С. 60 : фат.

**65 гадоў з дня нараджэння І. П. Панасюка (1960)** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. – С. 176.

**Панасюк Іван Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – 2-е выд., дапрац. і дап. - Кобрын, 2020. - С. 113-116 : фат.

**Помнікі** воінам-інтэрнацыяналістам. Лелікава. Мемарыяльная дошка У. В. Шапецюку // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 134-135 : фат.

# СПІС перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Аргументы и факты в Беларуси

Беларускі час

Белорусская нива

Бельскі гостінэць

Брестский курьер

Вечерний Брест

Голас Радзімы

Духовный вестник

Заря

Звязда

Камуністычная праца

Кобрин-информ

Кобрынскі веснік

Крыніца

Культура

Літаратура і мастацтва

Маладосць

Мая Радзіма

Народная газета

Народная трыбуна

Настаўніцкая газета

Нёман

Роднае слова

Рэспубліка

СБ. Беларусь сегодня.

7 дней

Сельская газета

Справа


ЛЕЛІКАВА
САРДЭЧНА
ЗАПРАШАЕМ


ПАМЯТАЙ
РОДНЫ
КУТ